WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛЮТАГА 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 22
(26886)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

2011 ГОД У БЕЛАРУСІ АБ'ЯЎЛЕНЫ ГОДАМ ПРАДПРЫМАЛЬНАСЦІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб аб'яўленні 2011 года Годам прадпрымальнасці. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 3 лютага.

Цяперашні год з'яўляецца стартам новай пяцігодкі і павінен надаць новы імпульс развіццю краіны. Калі на папярэдніх этапах развіцця сучаснага беларускага грамадства галоўным было адраджэнне і захаванне эканамічнага патэнцыялу Беларусі, то сёння перад грамадствам стаіць значна больш маштабная задача — зрабіць рашучы рывок ва ўсіх галінах і сферах дзейнасці, каб выйсці на ўзровень перадавых еўрапейскіх краін.

Асноўнай рухаючай сілай гэтага рыўка з'яўляюцца прадпрымальнасць, актыўнасць і ініцыятыва. Цяпер ад прадстаўнікоў любой прафесіі патрабуецца быць не проста выканаўцамі, якія дзейнічаюць па шаблону, а сапраўднымі гаспадарамі свайго лёсу, творчымі і энергічнымі людзьмі.

Аб'яўленне Года прадпрымальнасці падкрэслівае важкія дасягненні Беларусі ў стварэнні спрыяльных умоў для развіцця дзелавой актыўнасці і сімвалізуе накіраванасць беларускай дзяржавы ў будучыню, нацэленасць на прыярытэтную падтрымку людзей справы.

Год прадпрымальнасці будзе садзейнічаць стварэнню новага аблічча беларускай эканомікі, разняволенню дзелавой актыўнасці і ініцыятывы, фарміраванню атмасферы здаровай канкурэнцыі, спрыяльных умоў для ўкаранення новых тэхналогій ва ўсіх сферах, павышэнню дабрабыту і якасці жыцця грамадзян.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДЗНАЧАЕ СТРАТЭГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ ГАЛІНЫ ПЕРАПРАЦОЎКІ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫІ

На гэта ён звярнуў асаблівую ўвагу ўчора на нарадзе па пытаннях развіцця беларускай малочнай галіны, перадае БЕЛТА.

«Перапрацоўка сельгаспрадукцыі не толькі для Беларусі — для любой краіны ў сучасных умовах — набывае стратэгічнае значэнне, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Два мільярды насельніцтва ў свеце галадаюць. Усе бунты, якія адбываюцца сёння ў свеце, у тым ліку ў краінах Паўночнай Афрыкі, пачаліся таму, што не хапала прадуктаў харчавання, а тое, што было, — непад'ёмнае для 75 працэнтаў насельніцтва гэтых дзяржаў».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на заранку сваёй прэзідэнцкай дзейнасці «адбіў усялякія спробы прыватызацыі такіх галін, якія забяспечваюць харчовую бяспеку нашай дзяржавы». «Было выразна і адназначна заяўлена: мы самі павінны з гэтым справіцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Гэта датычылася малака- і мясаперапрацоўкі, мадэрнізацыі прадпрыемстваў па вытворчасці цукру, вытворчасці піва — усяго, што было звязана з прадуктамі харчавання.

Гаворачы аб малочнай галіне, Прэзідэнт адзначыў, што, вобразна кажучы, малако для Беларусі не проста тавар, а істотны фактар эканомікі і палітыкі, які аказвае сур'ёзны ўплыў як на забеспячэнне харчовай бяспекі, так і на нарошчванне экспарту. У Беларусі былі прыкладзены намаганні і затрачаны вялікія сродкі для дынамічнага развіцця малочнай галіны, дасягнуты добрыя вынікі. За 5 гадоў вытворчасць малака вырасла амаль на 35 працэнтаў. Забяспечыўшы ўнутраны рынак, больш як 50 працэнтаў малака, якое паступае на перапрацоўку, адправілі на экспарт. У мінулым годзе экспартавана амаль 4 млн тон малочнай прадукцыі. «І попыт на яе на сусветных рынках вельмі высокі. Геаграфія экспарту пашыраецца. У нас сёння ў чарзе стаяць: дайце малочную прадукцыю. Ужо нават пра цэны не пытаюцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў новым пяцігоддзі задачы стаяць яшчэ больш маштабныя. Да 2015 года неабходна выйсці на ўзровень вытворчасці 10 млн тон малака ў год і падвоіць экспарт малочных прадуктаў. У краіне трэба будзе пабудаваць амаль 900 новых і мадэрнізаваць каля 1,4 тыс. малочнатаварных ферм, павялічыць пагалоўе дойнага статка, пашырыць кармавую базу, прадоўжыць развіццё перапрацоўчай прамысловасці.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь павінна атрымліваць максімальную выгаду за кошт экспарту высакаякаснай малочнай прадукцыі. Для вырашэння гэтых задач спатрэбяцца значныя ўкладанні.

Беларусь можа спыніць супрацоўніцтва з кампаніяй «Юнімілк» у выпадку невыканання ёю ўзятых на сябе абавязацельстваў, заявіў Аляксандр Лукашэнка на нарадзе. «Калі вы ў першым квартале не выканаеце мае даручэнні, вы на рынку Беларусі больш працаваць не будзеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да кіраўніцтва французска-расійскай кампаніі «Данон-Юнімілк».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што супрацоўніцтва з гэтай кампаніяй невыпадкова разглядаецца на нарадзе. Паводле слоў Прэзідэнта, малочная галіна з'яўляецца смачным кавалкам для інвестараў, і ўсё часцей гэтыя пытанні пераходзяць у палітычную сферу.

Аляксандр Лукашэнка выказаў занепакоенасць у сувязі з тым, што супрацоўніцтва з кампаніяй «Юнімілк» абмяжоўваецца толькі перапрацоўкай і экспартам пітнога малака, гэта значыць фактычна вывазам сыравіны. «Мы яе пусцілі на наш малочны рынак, да сыравінных рэсурсаў на самых ільготных умовах. Але я катэгарычна папярэджваў аб недапушчальнасці вывазу з краіны прадукцыі з нізкай дабаўленай вартасцю. Больш таго, кампанія сама абяцала стварыць сучасныя малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы і развіваць сваю сыравінную базу. Аднак рэалізацыі гэтых абяцанняў пакуль не відаць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Мяне гэта да глыбіні душы абурае. Вы забылі, што вы працуеце не ў Расіі, а ў Беларусі. І пытанні карупцыі, пытанні дзяльбы, націску, дамоўленасці за рамкамі маіх рашэнняў недапушчальныя», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Я ведаю ўсё, нават пра што вы думаеце: як вы дзялілі дывідэнды, колькі атрымлівалі вашы прадстаўнікі ў Беларусі і г.д., нават куды вы гэтыя грошы накіравалі. Я ведаю ўсё», — дадаў ён.

«Я вас папярэджваў, што з вас ніхто не возьме ні капейкі, ніхто ад вас не будзе патрабаваць ніякага хабару, але вы працуйце сумленна. Я вызначыў вам напрамак работ», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Вы вырашылі: Прэзідэнт няхай гаворыць, а мы тут па-свойму зробім. Памыляецеся!» — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

МІНІСТЭРСТВЫ ІНФАРМАЦЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ МАЮЦЬ НАМЕР ПРАПАГАНДАВАЦЬ ДРУКАВАНУЮ КНІГУ

Аб гэтым заявіла першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч на калегіі Міністэрства культуры, прысвечанай выкананню галіновай праграмы па захаванні і развіцці культуры на 2006—2010 гады і задачам сферы культуры на 2011 год, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Першы намеснік міністра выказала ўдзячнасць Мінкультуры за тое, што культурная ніва за мінулы год стала больш цікавай, змястоўнай, і адзначыла, што айчынныя сродкі масавай інфармацыі заўсёды дэманструюць усё лепшае, што ёсць у сферы культуры. Пры гэтым Лілія Ананіч са шкадаваннем канстатавала, што ў мінулым годзе ў Беларусі было выдадзена толькі 11 тыс. назваў кніг тыражом 44 млн экзэмпляраў, што на 14-15 працэнтаў менш, чым у 2009 годзе. «Цікавасць грамадства да друкаванай кнігі знізілася, зменшыўся попыт, што прывяло да такіх паказчыкаў», — растлумачыла яна.

Міністэрства інфармацыі з дапамогай Міністэрства культуры мае намер прапагандаваць друкаваныя выданні. Так, работа ў падтрымку друкаванай кнігі разгорнецца ўжо на Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая адкрыецца 9 лютага. «Гэта — наш агульны ўклад у развіццё духоўнасці», — падкрэсліла Лілія Ананіч.

Міністр культуры Павел Латушка ў сваю чаргу падзякаваў за супрацоўніцтва Міністэрству інфармацыі і нагадаў аб некалькіх праектах, рэалізаваных Мінкультуры сумесна са СМІ. Сярод іх — фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» і «Уладзімір Сівакоў запрашае», «Вечары ў Мірскім замку».

БЕЛИНВЕСТБАНК

ПРОИЗВОДИТ ЗАКУПКУ АВТОМОБИЛЕЙ:

1. Вольво S 80 – 2 шт.
2. Фольксваген-Транспортер – 1 шт.
3. Шкода-Октавия – 6 шт.
4. Фольксваген-Каравелла, автобус – 2 шт.
5. Форд-Транзит, грузопассажирский – 1 шт.
6. Форд-Мондео – 3 шт.

Юридические лица, желающие принять участие в поставках автомобилей, могут предоставить коммерческие предложения по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29, каб. 206 с 9.00 до 17.00 в период до 17.00 14 февраля 2011 года. Тел. 2390106.

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006. УНП 807000028.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.02.2011 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 006,00	1 чэшская крона	172,05
▼ 1 еўра	4 145,88	1 польскі злоты	1 061,74
1 латвійскі лат	5 912,67	▲ 1 расійскі рубель	102,42
1 літоўскі літ	1 201,25	1 украінская грыўня	379,51

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,3489
10 UAH	36,9006
1000 BYR	9,7602
EUR	40,5279

АГЕНЦТВА УЗДАЎНАЙ ГРАШОВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«У ПРЫЛЕССІ» ЕЎРАПЕЙСКІ СЕРТЫФІКАТ

Па выніках мінулага года аграсядзіба «У Прылессі» Мінскага раёна прызнана адной з лепшых у Мінскай вобласці. Яна стала лаўрэатам у намінацыі «Гасціннасць». Але асаблівы гонар у гаспадара Сяргея Рукшты — за атрыманы міжнародны экалагічны сертыфікат і ўваходжанне ў пяцёрку самых лепшых аграсядзіб краіны. А сертыфікат пацвярждае, што ў аграсядзібе «У Прылессі» чыстае экалагічнае харчаванне, гэта тэрыторыя вольная ад тытуню. Тут выкарыстоўваюцца выключна арганічныя ўгнаенні, а таксама ўтылізуецца смецце.

— Ніхто больш за нашу аграсядзібу летась не прыняў гасцей, — кажа Сяргей, — 1720 чалавек!

У гэтыя дні ў «У Прылессі» госці катаюцца на лыжах і наведваюць лазню з парылкай. Менавіта актыўны адпачынак і вабіць у вёску Прылессе да Сяргея Рукшты.

Жыллёшча

ЗА ЯКОЕ ТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ Я ПЛАЧУ ЖЭСУ?

Пасля «патлусцелых» снежаньскіх жыровак чытачы сталі больш пільна сачыць за тым, якія катэгорыі выдаткаў ім прапануюцца і што за сумы там стаяць. «За апошні месяц я заплаціла 35 тысяч за тэхабслугоўванне. А нядаўна прыйшлі з ЖЭСа і патрабавалі скідвацца на рамонт пад'езда. Я была ў шоку. За што тады я плачу 35 тысяч?» — абураецца Станіслава з Мінска.

— У тэхабслугоўванне не ўваходзіць бягучы рамонт пад'езда, — адказалі на пытанне Станіславы ў ЖРЭА Маскоўскага раёна. — Грошы на тэхабслугоўванне ідуць на агляд цеплавузлоў, дахаў, сантэхнікі і г.д.

У мінулым годзе Уладзімір Рэянтовіч, дырэктар ГА «Мінская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка», паведамляў, што, каб выканаць той ці іншы від працы, супрацоўнікі жыллёвай арганізацыі першапачаткова арганізоўваюць агульны сход з жыльцамі дома. Пасля праводзіцца пакватэрнае апытанне жыльцоў. І калі дзве траціны жыхароў згодныя, то жыллёва-камунальная арганізацыя можа прыступіць да рамонтных работ. І грошы за рамонт пасля будуць уключацца ў жыроўкі. Але як было адзначана «Мінскай жыллёва-камунальнай гаспадаркай», плата будзе ўтрымлівацца нават з тых, хто не даваў сваёй згоды. Для малазабяспечаных і пенсіянераў прадугледжана растэрміноўка плацяжу да паўгода.

— Я жыву ў вуглавой кватэры з пакватэрным лічыльнікам цяпла. Я трачу цяпла больш, чым мае суседзі, якіх я фактычна грэю. Чула, што ў такіх выпадках выкарыстоўваецца паніжальны каэфіцыент. Куды мне звяртацца, каб яго прымянілі і зрабілі перараслік?

Кацярына, *Мінск.*

Як паведамілі ва ўпраўленні жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінгарвыканкама, у сталіцы абслугоўваннем і ўсталёўкай пакватэрных лічыльнікаў цяпла займаецца адзіная кампанія «Іста».

— У тым выпадку, калі заключана дамова паміж намі і абслугоўваючай арганізацыяй дома (ЖЭС, ТУ і інш.), то мы пры выкананні разлікаў адразу прымяняем гэты паніжальны каэфіцыент, — кажа начальнік абаненцкага аддзела кампаніі «Іста» Ала Азерская. — Калі ж з намі дамова на выкананне разлікаў не заключана, то, наколькі прафесійна ажыццяўляюцца разлікі і ці прымяняецца паніжальны каэфіцыент, я не ведаю. Калі жыхарам патрэбныя нейкія падрабязнасці, то яны могуць тэлефанаваць непасрэдна ў нашу кампанію.

Па словах Алы Азерскай, самымі «праблемнымі», як правіла, з'яўляюцца вуглавыя кватэры на верхніх паверхах. У параўнанні з астатнімі кватэрамі яны могуць спажываць на 40 працэнтаў цяпла больш.

— Скажыце, ці павінны дворнікі выдаваць шуфлі для чысткі снегу каля аўтамабіля?

Аляксандр, *Мінск.*

— Раней іх выдавалі, але цяпер кожнаму неабходна мець свой, — паведамілі ў дыспетчарскай службе ЖРЭА Маскоўскага раёна. — Кожны аўтамабіліст павінен чысціць вакол сваёй машыны на адлегласці 1 м і сваім шуфлем.

Настасся ЗАНЬКО.

НАБРАЎ У ДОЎГ $200 ТЫСЯЧ

Каб не плаціць па рахунках, бізнэсмен пагражаў пазыкадаўцу забойствам

Наогул, на абяцанні дырэктара аднаго з прыватных прадпрыемстваў «купіўся» не адзін чалавек. Паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Ганны Чыж-Літаш, напачатку ў знаёмага ён пад чэснае слова пазычыў 50 тысяч долараў. Грошы ўзяў, а, калі прыйшлося іх вяртаць, аддаў не ўсю суму, спаслаўшыся на часовыя цяжкасці. Наступнай ахвярай махляра стаў ужо іншы яго сябар, якога бізнэсмен «расчуліў» на 146 мільёнаў рублёў. Калі ж прыйшоў час вяртаць доўг, зноў ашукаў чалавека: разлічыўся напалову, а астатнюю паабяцаў аддаць пазней. Але не ламаў галаву, як гэта зрабіць, а напазычаў яшчэ каля 70 тысяч долараў. Апошняе і стала падставай да таго, што крэдыторы звярнуліся па дапамогу да праваахоўнікаў. А падчас следства па заведзенай крымінальнай справе высветлілася, што ён пагражаў аднаму пазыкадаўцу забойствам. Паводле слоў пацярпелага, такім чынам падазроны спрабаваў яго напужаць, каб не вяртаць грошай.

Ігар ГРЫШЫН.

Анатоль ТОЗІК:

Зала калегіі

«НАМ ТРЭБА НАВУЧЫЦЦА ВЫЛУЧАЦЬ ГАЛОЎНАЕ...»

Учора ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства краіны падводзіліся вынікі работы сістэмы адукацыі за 2010 год і вызначаліся прыярытэтныя задачы для сістэмы адукацыі як на бягучы год, так і на бліжэйшую пяцігодку.

— Адукацыя разглядаецца сусветнай супольнасцю як адзін з важнейшых фактараў стабільнасці эканомік, як рухавік іх устойлівага развіцця, — падкрэсліў у сваім выступленні першы **намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК**. — Па ацэнках міжнародных экспертаў, ужо сёння адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, эканоміка якіх развіваецца, толькі на адну трэць абумоўлены розніцай у эканоміцы, а на дзве трэці — розніцай ва ўзроўні і якасці адукацыі.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК, які таксама ўзяў удзел у выніковай калегіі Міністэрства адукацыі, падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі:

— Я лічу, што нам трэба навучыцца вылучаць галоўнае, каб хутка рухацца наперад. Неабходна вызначыць некалькі суперактуальных праблем і заняцца іх вырашэннем. Напрыклад, на парадку дня сёння стаіць пытанне авалодання нашымі грамадзянамі замежнымі мовамі. Прывяду толькі адзін прыклад. У апараце Савета Міністраў працуюць 332 супрацоўнікі і ніводзін з іх не валодае свабодна замежнымі мовамі. І гэта ў краіне, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на еўрапейскім скрыжаванні! Як можна сцвярджаць, што мы актыўна вядзём работу з інвестарамі, што мы маем з імі штодзённыя стасункі? Мае апаненты кажуць, што ўстановы адукацыі штогод выпускаюць 3 тысячы спецыялістаў з веданнем замежных моў, але яны незапатрабаваныя на рынку працы. Я з гэтым пагадзіцца не магу. Ваша задача — рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры, а наша задача — шукаць ім работу. І я не магу падтрымаць намер Міністэрства адукацыі па ўвядзенні ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах прафесійна арыентаванага курсу замежнай мовы. Давайце рэальна глядзець на сітуацыю і супастаўляць жаданае з нашымі магчымасцямі. Няўжо муляру на будоўлі спатрэбіцца замежная мова? Канешне, ёсць сферы, дзе б работнікам не пашкодзіла валодаць хоць бы мінімумам слоўнікавага запасу для ўстанаўлення кантактаў з іншаземцамі — напрыклад, у сферы гандлю ці ў сферы грамадскага харчавання. Але і там замежная мова спатрэбіцца далёка не кожнаму. Мяркую, што калі ўзнікне такая неабходнасць, то наймальнік можа адправіць сваіх падначаленых на кароткатэрміновыя курсы вывучэння замежных моў, каб тыя вывучылі 100-200 фраз і маглі зразумець нашых гасцей з замежжа. А вось прапанова па замене школьных падручнікаў на электронныя планшэты — гэта адназначна крок наперад.

«У апараце Савета Міністраў працуюць 332 супрацоўнікі і ніводзін з іх не валодае свабодна замежнымі мовамі. І гэта ў краіне, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на еўрапейскім скрыжаванні! »

Трэба патлумачыць, што Аляксандр Жук прапанаваў у якасці альтэрнатывы школьным падручнікам на папяровых носьбітах электронныя планшэты. Адзін такі планшэт дазваляе закачаць тэксты усіх падручнікаў для агульнаадукацыйнай школы, прычым за ўсе класы. Такім чынам наша краіна зможа эканоміць штогод больш як 20 мільярдаў рублёў, якія патрабуюцца на перавыданне школьнай вучэбнай літаратуры. На думку Аляксандра Жука, выпуск такога электроннага прадукту магчыма ажыццяўляць непасрэдна ў Беларусі. Распрацоўку элементнай базы можа ўзяць на сябе той жа «Інтэграл». А праграмны прадукт могуць распрацаваць спецыялісты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і БДУІР. Праект цалкам акупляльны, паколькі патрэбы краіны ацэньваюцца як мінімум у 1 мільён планшэтаў толькі для школьнікаў. З улікам такіх падыходаў кошт планшэтаў будзе прымальны для спажыўцоў. Да таго ж гэта адразу ацэняць і школьнікі, і іх бацькі, паколькі дзецям не прыйдзецца больш цягаць штодня цяжкія сумкі з падручнікамі, больш таго, кожны з іх зможа пры неабходнасці адкрыць і «асвяжыць» свае веды па любой дысцыпліне за любы клас і ў любы зручны для іх час.

СТАР. 2

«КРЫЛАТАЯ «ПЕШКА» Ў БАЛОЦЕ

У Дубровенскім раёне пошукаўцы недалёка ад вёскі Вежкі дастаюць з балота савецкі самалёт, збіты фашыстамі падчас вайны. Гэта легендарная «пешка», упэўнена мяркуюць удзельнікі пошукавых работ. На вачах карэспандэнта «Звязды» выцягнулі з-пад вады балота зброю, устаноўленую на самалёце, і іншыя фрагменты крылатай машыны. Паказалі энтузіясты, як выкарыстоўваюць спецыяльныя тэхналогіі і абсталяванне. Яны канстатуюць, што... час спыніўся ў балоце.

Нагадаю, «Звязда» ў 2009 годзе пісала пра тое, як даставалі гэты самалёт з балота. Знайшлі і астанкі двух членаў экіпажа. Цяпер работы працягваюцца.

— Тры гады таму мае знаёмыя расказалі мне, што тут, у балоце, ляжыць самалёт, — гаворыць **пошукавец з Санкт-Пецярбурга Сяргей Уладзіміравіч ХАРЛАНЦЬЕЎ**. Ён наш зямляк са Шклоўшчыны. Пошукавымі работамі займаецца гадоў пятнаццаць. — Прадстаўляю тут атрад пошукаўцаў «Гвардзеец». Праводзім сумесную беларуска-расійскую аперацыю. Я спачатку не паверыў пра самалёт у балоце. Гаварыць можна ўсякае, а дзе доказы? Мы тады прыехалі сюды з бацькам і таварышам. І ўжо на месцы пераканаліся: насамрэч ёсць што шукаць. Што маглі, падняслі летам 2009-га, далей працаваць стала небяспечна: берагі катлавана абвальваліся.

Цяпер, зімой, працягваем работы. Плануем на днях падняць і рухавік, пасля чаго па яго нумары можна будзе высветліць прозвішчы лётчыкаў. Лопасць і іншыя дэталі самалёта ўказваюць на тое, што гэта «пешка». Мяркуючы па тым, што знайшлі, адразу бачна: у самалёт стралялі. Потым самалёт яшчэ і гарэў...

— Якую складаную тэхніку выкарыстоўвалі пры работах?

— Самая складаная «тэхніка»? Рыдлёўкі і рукі чалавечыя! Зразумела, выкарыстоўвалі экскаватар. Але, у асноўным, усё робіцца рукамі. Шмат маленькіх фрагментаў, якія той жа экскаватар можа пашкодзіць, ёсць і іншыя нюансы ў нашай рабоце. Некалькі дзён насілі тросы на спіне, а потым выцягвалі...

— А ці праўда, што балота «кансервуе» тое, што ў ім знаходзіцца?

— Так. Аднойчы, праўда, зусім у іншым месцы знайшлі шакалад часоў вайны, і есці яго можна было. У балоце спыняецца час. А на гэтым месцы знайшлі і прачыталі ліст з дому лётчыку, дзе гаварылася пра яго сына, які хоча бацьку бачыць, кніжку для атрымання абмундзіравання, грошы...

— Мы тут ужо працуем тыдзень. Плануем яшчэ некалькі дзён. Самалёт гэты ўнікальны тым, што быў створаны як знішчальнік, два кілі ў яго, а потым выкарыстоўваўся як бамбардзіроўшчык. Самалёт вытрымліваў 11-разовыя перагрузкі, выконваў усе фігуры вышэйшага пілатажу, — расказвае **кіраўнік пошукова-рэстаўрацыйнай групы фонду «Памяць Афгана» Ігар МАЦЮК.** — Раней мы меркавалі, што ў балоце «ІЛ — 2» (знакамітыя «лятаючы танк». — **А.П.**), але, мяркуючы па апошніх знаходках, зрабілі выснову, што гэта «ПЕ-2». Магчыма, трэці чалавек, які быў у экіпажы, выратаваўся... Было трое. Мы зможам высветліць, хто былі гэтыя людзі.

Ваенны камісар Дубровенскага раёна Ігар ЛІТОЎЧЫК канстатуе, што за адзінаццаць гадоў, што ён займае гэтую пасаду, упершыню праводзіцца пошукавая акцыя. Ён паказаў грошы, якія знайшлі ў рэштках адзення тых, хто знаходзіўся ў самалёце. Адзначыў, што такія акцыі маюць вельмі вялікае патрыятычнае значэнне.

Фрагменты «пешкі» запланавалі выкарыстаць пры стварэнні копіі самалёта, якая зойме ганаровае месца ў беларускім музеі авіяцыі. На жаль, прозвішчы загінулых членаў экіпажа пакуль невядомыя. Іх астанкі пахаваныя ў брацкай магіле недалёка ад гэтага месца. Калі ўстановяць, абавязкова запросяць сваякоў герояў. І сына лётчыка, пра якога расказваецца ў лісце, што знайшлі ў кабіне. Пра тое, што даўно яго не бачыў...

Аляксандр ПУКШАНСКІ, *Дубровенскі раён.*

Фота аўтара і БЕЛТА.

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ» состоится 14 февраля 2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О внесении дополнений в устав ОАО «Белгорхимпром».

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712

Конкурсный управляющий КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» — УП «ДжиЭс плюс» (www.gsplus.by) — ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 10.03.2011 г. в 12 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА (на повышение начальной цены) по продаже имущества:

Лот № 1. Здание склада готовой продукции сушильного цеха — 396 кв. м. Здание пристройки к сушильному цеху с навесом — 305 кв. м. Здание гаража для машин — 314 кв. м. Административное здание — 504 кв.м. Здание теплицы — 262 кв.м. Здание кузницы — 11 кв.м. Капитальное строение с инвентарным номером 443/С-1254 — 3760 кв.м. Здание котельной — 792 кв.м. Здание весовой 10 тонн — 55 кв.м. Навес для хранения сырья — 388 кв.м. Здание квасильно-засолочного пункта — 824 кв.м. Здание квасильно-засолочного пункта — 328 кв.м. Здание склада, карамельного цеха, сокового цеха — 1082 кв.м. Здание весовой 25 тонн — 109 кв.м. Здание насосной гидротранспортных вод — 30 кв.м. Здание насосной второго подъема — 194 кв.м. Здание канализационной насосной станции — 124 кв.м. Здание картофелехранилища № 5 — 2608 кв.м. Здание цеха сухого картофельного пюре — 4113 кв.м. Здание пожарного депо — 265 кв.м. Емкость № 1. Емкость № 2. Емкость № 3. Емкость № 4. Емкость № 5. Здание склада ГСМ № 2 — 41 кв.м. Здание установки для мазутоснабжения — 82 кв.м. Здание мазутонасосной — 24 кв.м. Отстойник гидротранспортных вод — 2663 кв.м. Очистные сооружения дождевых вод — 139 кв. м. Пожарный резервуар № 1. Пожарный резервуар № 2. Покрытия. Приемник картофеля. Приемник картофеля № 2. Резервуар с фильтром. Канализационная сеть. Линии электропередач. Тепловые сети. Водопроводная сеть. Мазутопровод. Зеленые насаждения (плодоносящие яблони). Ограждения.

Начальная цена 6 964 400 000 рублей без учета НДС в размере 20 %. Задаток 348 220 000 рублей. Шаг торгов — 348 220 000 рублей.

Все недвижимое имущество общей площадью около 22 000 метров квадратных расположено **в Гродненской обл., Сморгонский р-н, д. Солы, ул. Социалистическая, 54** на территории общей площадью 14 га. Через территорию проходит действующий участок железной дороги. Имеется электричество, водоснабжение и газовое отопление всех зданий.

В сети Интернет план застройки территории завода, имеющихся сетей, иной информации можно найти на: **http://gsplus.by/blocks/posts/130/**

Прием заявок происходит по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 с даты настоящей публикации **до 09.03.2011 г.** с 9.00 до 18.00, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договоров и др. документов. Тел. в г. Минске: 8(017) 2046870. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации **до 09.03.2011 г.** на р/с КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» № 3012205980013 в ОАО «Белагропромбанк» отд. в г. Сморгонь, код 460, УНП 590340550.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Способ уведомления участников об итогах торгов: в день торгов, публично.

В случае заявки одного участника на аукцион ему будет предложено приобрести выставляемый лот по начальной цене плюс 5 (пять) процентов.

ВЫГАДНЫ АБМЕН

Утакі самы дзень 1997 года паміж Беларуссю і Венесуэлай былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны. І вось што мы можам сказаць 14 гадамі пазней: партнёрства дзвюх краін зрабілася сапраўды стратэгічным. Нягледзячы на рознасць культур і менталітэту, ім удалося знайсці агульную мову. Сёння гэты сумесны «слоўнік» налічвае больш як 120 пагадненняў. У якіх толькі галінах яны не рэгулююць супрацоўніцтва! Ад будаўніцтва аўтазаводаў да сумесных праектаў у сферы адукацыі і культуры.

Самым уражальным набыткам узаемадзеяння, несумненна, з'яўляюцца пастаўкі венесуэльскай нафты ў Беларусь, якія спачатку не выклікалі нічога, апроч скепсісу. Але ж праект сапраўды рэалізуецца ды набірае абароты. І ўжо не колькі-небудзь, а да 10 млн тон венесуэльскай нафты будуць пастаўлены ў Беларусь сёлета і налета.

— Кантракты будуць выконвацца, няма абсалютна ніякіх праблем, — пацвярджае на сустрэчы з журналістамі **пасол Венесуэлы ў Беларусі Амерыка ДЗІЯС НУНЬЕС**.

Адно «але», праўда, усё ж ёсць. Ехаць сюды — не блізкі свет. Выдаткі на транспарціроўку «чорнага золата» ў выніку таксама «залатыя».

— Таму мы вырашылі прапанаваць другі варыянт, — кажа дыпламат. — Пастаўкі азербайджанскай нафты па своп-кантрактах (дамовах абмену, па-беларуску кажучы. — **Аўт.**).

Фокус у чым: Азербайджан будзе пастаўляць нафту ў Беларусь, а сам атрымліваць столькі ж ад Венесуэлы. Проста адлегласць ад сяброўскай лацінаамерыканскай краіны да чарнаморскіх партоў — амаль 14 тысяч км. У той час як Азербайджан і месца прызначэння падзяляе менш за 1,5 тысячы км. Грэх не абмяняцца, пагадзіцеся.

— Размова не ідзе пра замяшчэнне венесуэльскай нафты азербайджанскай, — супакойвае кіраўнік дыпмісіі. — Гутарка вядзецца пра дадатковыя пастаўкі для забеспячэння заяўленых аб'ёмаў.

Чарнаморскі порт, да слова, — не адзіны варыянт маршруту. Амерыка Дзіяс Нуньес нагадаў, што разлічваліся самыя аптымальныя варыянты. Прычым выходзілі з пасылу, што абодва беларускія НПЗ павінны быць запоўненымі і працаваць у нармальным рэжыме. Украінскі порт у гэтым плане выйграваў у літоўскага: мог прыняць большыя аб'ёмы, таму менавіта яму і аддавалася перавага. Аднак канкурэнцыя — справа, якая стымулюе. І вось ужо літоўскі бок, паводле інфармацыі дыпламата, заяўляе пра магчымасць павелічэння магутнасцяў. А цікавыя прапановы, безумоўна, не застаюцца без увагі. Сітуацыя аналізуецца, работа ў гэтым кірунку вядзецца, адзначае пасол.

Даўно ўжо ходзяць чуткі (а апошнім часам стала чуваць і з некаторых афіцыйных крыніц), што частка актываў беларускіх НПЗ могуць перайсці ў венесуэльскія рукі. Амерыка Дзіяс Нуньес ад пацвярджэнняў, як і ад абвяржэнняў, устрымаўся. Сказаў толькі, што гэтыя пытанні, сярод іншых, будуць абмеркаваны на пасяджэнні сумеснай беларуска-венесуэльскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Яно мае адбыцца ўжо ў гэтым месяцы, месца сустрэчы — Каракас. Там узгодняць тэрміны візіту на найвышэйшым узроўні, разгледзяць перспектывы інвестыцыйных праектаў і ход выканання наяўных дамоўленасцяў.

За два гады рэалізацыі нафтавых праектаў у Венесуэле бюджэт Беларусі, паводле інфармацыі пасла, папоўніўся на 52 млн долараў. Ён упэўнены, што лічба будзе толькі расці: сумеснаму прадпрыемству («Петралера БелаВенесалана») дададзены новыя радовішчы нафты. А сёлета яно можа атрымаць і газавыя радовішчы.

Нафта-газавы сектар, зразумела, — ключавы ў двухбаковым супрацоўніцтве, але не адзіны. У Беларусі таксама ёсць чым падзяліцца з лацінаамерыканскай сяброўкай. Абменьваемся не толькі таварамі, але і, так бы мовіць, ноу-хау. Венесуэла зараз адчувае велізарны дэфіцыт жылля. Таму адпаведныя кантракты пашыраюцца. Калі раней дамаўляліся на будаўніцтва 20 тыс. кватэр намаганнямі беларускіх спецыялістаў, то цяпер абмяркоўваецца, ці не дадаць да іх яшчэ 10 тысяч.

Прыкладна такую ж жыццёвую патрэбу адчуваюць венесуэльцы і ў малацэ: спажыванне апошнім часам рэзка павялічылася. Атрымліваючы з паўднёвага кантыненту багацце чорнае, мы ахвотна дзелімся белым. Сёлета, напрыклад, запланаваны пастаўкі 16 тыс. тон сухога малака з Беларусі ў Венесуэлу. І гэтыя лічбы, на думку дыпламата, могуць павялічыцца. З падачы беларусаў у спякотнай заакіянскай краіне могуць з'явіцца найсучаснейшыя аграпрамысловыя гарадкі. Пілотны праект у штаце Гуарыка распрацоўваецца ўшчыльную. Яго вопыт пакажа, ці прыжылася ў Венесуэле беларуская «фішка».

І як сапраўдныя сяброўкі, краіны заўжды гатовыя працягнуць адна адной руку дапамогі. З-за праліўных дажджоў такая дапамога летась спатрэбілася Венесуэле. Беларусь аператыўна скіравала прадукты харчавання, медыкаменты, палаткі, адзенне для дзяцей ды іншыя неабходныя рэчы. І ёй за гэта вельмі ўдзячны. Краіны гатовыя не толькі дзяліць бядоты, але і памнажаць радасць. Сёлета беларуская моладзь, задзейнічаная ў танцавальным і музычным калектывах Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара ў Мінску, здзейсніць ваяж у Венесуэлу, куды іх запрасіў кіраўнік дзяржавы. І выступіць там перад лацінаамерыканскай публікай.

Ала МАЧАЛАВА.

УВЕДОМЛЕНИЕ
о созыве очередного общего собрания акционеров ОАО «Старая фабрика»

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика» извещает акционеров Общества о проведении очередного общего собрания акционеров.

Собрание состоится 10 марта 2011 года в 10 часов 00 минут в помещении Общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году.
2. Утверждение бухгалтерского баланса и направлений использования чистой прибыли за 2010 год. Утверждение дивидендов за 2010 год.
3. Утверждение направления использования чистой прибыли, которая будет получена в 2011 году.
4. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о работе в 2010 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания будет проводиться в день проведения собрания с 9.30 до 10.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100640022 **Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика».**

ЧЫЙ ТРЫКАТАЖ?

На станцыі Баранавічы-Палескія супрацоўнікі міліцыі зазірнулі ў дызель Удрыцк-Баранавічы і знайшлі там сумкі з трыкатажнымі вырабамі на 42 млн рублёў.

Гаспадара тавару знайсці не ўдалося.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Грошы

ЮАНІ ТРАПІЛІ Ў СКАРБОНКУ

Беларусы пачалі зберагаць не толькі ў рублях, доларах і еўра, але і ў кітайскай валюце

ПРАЎДА, пакуль кітайскай валюты ў банкаўскіх укладах насельніцтва трымае няшмат, і пераважна стаўку на юань робяць жыхары сталіцы. Як зазначыла падчас сустрэчы з журналістамі старшыня праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Надзея Ермакова, на цяперашні час на дэпазітах насельніцтва ў банку знаходзіцца каля мільёна юаняў. Разам з тым, пачатак сёлетняга года вызначаецца істотным прытокам у банк укладаў у беларускіх рублях: людзі ўбачылі, што непрыемных сюрпрызаў з нацыянальнай валютай не адбылося, і пасля ліхаманкавай гонкі за цвёрдаканверсоўнай напрыканцы года пад уплывам чутак пра дэвальвацыю зноў укладваюць свае сродкі ў больш даходны інструмент.

Тым больш, як запэўнівае Надзея Ермакова, у «Беларусбанку» цяпер не разглядаецца пытанне аб зменшэнні працэнтных ставак па дэпазітах у нацыянальнай валюце, якія цяпер складаюць 16-17 працэнтаў гадавых. «Гэта дастаткова высокая стаўка», — зазначыла банкір. Надзея Ермакова таксама дадала, што пры цяперашніх стаўках па крэдытах павышаць даходнасць рублёвых укладаў проста нерэальна.

Што датычыцца ўмоў крэдытавання, то мяняць іх у «Беларусбанку» не бачаць падстаў: яны ўжо адпрацаваныя, і неабходнасці ў такім кроку няма. Аднак па раней выдадзеных крэдытах на будаўніцтва жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, банк зменіць стаўку ўжо ў бліжэйшы час: з 15 люстага яна будзе зніжана з 17 да 14,5 працэнта гадавых. Акрамя таго, у фінансавай установе разглядаецца пытанне аб падаўжэнні тэрмінаў спажывецкіх крэдытаў з 3 да 5 гадоў, і адпаведнае рашэнне будзе прынята ў бліжэйшы час.

Наогул жа прэс-канферэнцыя старшыні праўлення буйнейшага банка краіны была прысвечана вынікам яго працы летась і за апошнія пяць гадоў. Як падкрэсліла кіраўніца «Беларусбанка», нягледзячы на тое, што ў рэспубліку прыйшоў капітал буйных расійскіх банкаў, «Беларусбанк» не страціў пазіцыі на рынку банкаўскіх паслуг і ўпэўнена захоўвае ў сярэднім 40-50 працэнтаў долі на розных яго сегментах. Так, па рэсурснай базе ён займае 41 працэнт рынку, памер рэсурснай базы за 5 гадоў павялічыўся амаль у 6 разоў і на 1 студзеня гэтага года склаў 52 трыльёны рублёў. Доля банка ў банкаўскай сістэме краіны па прыцягненні сродкаў насельніцтва складае больш за 53 працэнты. За мінулыя пяць гадоў памер сродкаў насельніцтва, прыцягнутых на рахункі «Беларусбанка», вырас у 3,8 раза — на пачатак студзеня ён дасягнуў 13 трыльёнаў. А аб'ём сродкаў юрыдычных асоб за пяцігодку павялічыўся ў 5 разоў — да 15 трыльёнаў.

Паводле слоў Надзеі Ермаковай, важнейшым напрамкам працы банка з'яўляецца міжнароднае супрацоўніцтва. Аб'ём прыцягнутых замежных рэсурсаў на пачатак года склаў 976 мільёнаў долараў ЗША. Для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў кліентаў банка з 2006 года было заключана больш за 22 крэдытныя пагадненні па прыцягненні замежных рэсурсаў. Толькі летась было заключана 79 крэдытных пагадненняў на 530 мільёнаў доларай. Сярод апошніх буйнейшых праектаў кіраўнік банка згадала фінансаванне пакупкі хуткасных электрапаяздоў швейцарскай кампаніі, рэканструкцыю гасцініцы «Кастрычніцкая» ў «Прэзідэнт-атэль» і іншыя.

За апошнія 5 гадоў, падкрэсліла банкір, «Беларусбанк» дасягнуў выдатных вынікаў па ўмацаванні даверу і павышэнні іміджу ў сусветнай банкаўскай супольнасці. Ацэнкі ўплывовых рэйтынгавых агенцтваў Moody's і Fitch Ratings пацвярджаюць эфектыўнасць дзейнасці, паляпшэнне фінансавых паказчыкаў, захаванне стабільнасці развіцця і фінансавай устойлівасці банка. Як адзначыла Надзея Ермакова, доўгатэрміновы прагноз, вызначаны апошнім Міжнародным рэйтынгавым агенцтвам, кваліфікуецца як «стабільны». Яна таксама паведаміла, што ў бліжэйшы час банк плануе атрымаць рэйтынг яшчэ аднаго міжнароднага рэйтынгавага агенцтва, якое цяпер працуе ў рэспубліцы па краінавым рэйтынгу. Між іншым, у рэйтынгу ТОП-1000 буйнейшых банкаў свету «Беларусбанк» вырас з 600 у 2008 годзе да 452 месца.

Сёння «Беларусбанк» з'яўляецца і буйнейшым крэдытарам эканомікі — займае 42 працэнты рынку. З 2006 года памер крэдытных укладанняў банка вырас у 6,6 раза пры росце сукупнага крэдытнага партфелю банкаўскай сістэмы краіны ў 7 разоў. Памер крэдытаў эканоміцы на 1 студзеня перавысіў 40 трыльёнаў рублёў, а фізічным асобам — больш за 15 трыльёнаў (больш як 800 тысяч беларусаў пазычылі грошы ў банку).

«Паслядоўная і планамерная работа «Беларусбанка» дазволіла за апошнія пяць гадоў атрымаць прыбытак у памеры 1,3 трыльёна рублёў, пры першапачатковым плане 1 трыльён, — адзначыла Надзея Ермакова. — У тым ліку ў 2010 годзе — 510 мільярдаў рублёў, што складае 30 працэнтаў прыбытку ўсёй банкаўскай сістэмы Беларусі».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Парламенцкі дзённік

І З БОКУ БАНКАЎ

Знізіць рызыкі крэдыторaў і актывізаваць жыллёвы рынак, на думку фінансістаў, здольная норма аб безагаворачным высяленні даўжнікоў па іпатэцы

З мэтай вызначыліся: іпатэцы быць. Са шляхам да яе... пакуль пытанні. Як мінімізаваць рызыку неплацяжоў, удасканальваць інструменты закладных і страхавання? Ёсць нават накіды па стварэнні закона аб банкруцтве фізічных асоб, які абараняў бы рэшты банкаў і тых, хто атрымлівае крэдыты... Як спаганяць пазыку — ствараць калектарскія агенцтвы (зборшчыкі даўгоў па сутнасці)? Нарэшце як высяляць даўжнікоў, асабліва з дзецьмі ці недзеяздольнымі? Куды ім падзецца — у спецыяльна створанае жыллё з абменнага фонду? На чые грошы яго ўзводзіць? Хто будзе высяляць, прадаваць, абменьваць? Безліч такіх запытанняў разгледзелі з усіх бакоў у ніжняй палаце парламента — на пасяджэнні пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі. І з боку заканадаўцаў, якія па традыцыі выказваліся ад імя выбаршчыкаў, і з боку Мінэканомікі, і з боку Мінадукацыі, і з боку спецыялістаў па страхаванні, і з боку банкаў. Калізіі выяўленыя, памылковыя стэрэатыпы выкрытыя. Справа за малым — прынцыповымі рашэннямі.

КАЛІЗІЯ ПЕРШАЯ: ВЫСЯЛЕННЕ ДАЎЖНІКОЎ

Пуга ў выглядзе высялення неплацельшчыкаў па іпатэцы (механізм якога ў нас адсутнічае), на першы погляд, карысная. Яна развязвае рукі банкам і дае ўпэўненасць у тым, што сваё яны вернуць. Тым самым стымулюе іх пазычаць людзям грошы пад заклад маёмасці. У той жа час не варта забывацца, што разам з незадачлівымі фінансістамі, можна выставіць на двор малых дзяцей, інвалідаў, недзеяздольных. Дзейным заканадаўствам яны абароненыя: жыллё можа быць спагнанае толькі з дазволу органаў апекі і папячыцельства. Дэпутаты схільныя пакінуць дзейны парадак. Аднак, мабыць, з-за яго іпатэка і не працуе ў поўным аб'ёме. Таму пазіцыя галоўнага банка краіны адназначная: высяляць усіх без агаворак.

Намеснік старшыні Праўлення Нацбанка Сяргей ДУБКОЎ пераканаў, што рэальным інструментам для актывізацыі іпатэкі можа стаць норма аб высяленні даўжнікоў не са згоды органаў апекі, а з паведамленнем ім. І тэрмін прапануе — у тры месяцы. Сваю пазіцыю банкір досыць пераканальна аргументуе. З аднаго боку на шалях — абарона правоў дзяцей, чые бацькі пацярпелі фінансавыя цяжкасці і могуць быць выселеныя. З іншага — абарона правоў дзяцей, чые бацькі паклалі грошы на дэпазіты. Паводле яго слоў, з кожных 5 рублёў, якія банкі даюць у крэдыт, 4 яны атрымалі ў кагосьці (ці то акцыянераў, ці то ўкладчыкаў). Да таго ж, на думку спадара Дубкова, норма аб безагаворачным высяленні будзе дысцыплінаваць тых пазычальнікаў, якія загадзя робяць разлік: возьмем крэдыт, нас потым усё роўна не выселяць.

КАЛІЗІЯ ДРУГАЯ: СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ЖЫЛЛЁВЫЯ ФОНДЫ

Дэпутат Таццяна ФІЛІМОНЧЫК выступіла з прапановай, каб будаўніцтвам арэндных дамоў заняліся самі банкі. Маўляў, і неплацельшчыкам будзе куды выселіцца, і банкам прыбытак.

— Тактычна, мабыць, гэта і камфортна, але не думаю, што будзе стратэгічна правільна, калі банк будзе займацца не сваёй справай, — каментуе Сяргей Дубкоў і дадае, што сацыяльная абарона — задача не банка, а органаў дзяржкіравання.

Намеснік міністра эканомікі Беларусі Анатоль ФІЛОНАЎ лічыць, што стварэнне адмысловых фондаў за кошт дзяржавы бесперспектыўнае і неапраўданае. Маўляў, дай Бог, каб дзяржава справілася з зададзенымі аб'ёмамі сацыяльнага жыллёвага будаўніцтва. У такім разе хто будзе іх спансіраваць? Пытанне застаецца адкрытым.

КАЛІЗІЯ ТРЭЦЯЯ: ПАРУЧЫЦЕЛЬСТВА

Гэты інстытут апошнім часам стаў даваць збоі, заўважае **старшыня пастаяннай камісіі Галіна ПАЛЯНСКАЯ**. Калі раней мела месца прававая неадукаванасць і людзі не ўсведамлялі, што нясуць салідарную адказнасць (таксама будуць выплачваць пазыку ў выпадку чаго), то цяпер сталі ставіцца больш насцярожана. Карацей, прэтэндэнтаў на крэдыт сёння куды больш, чым тых, хто хоча і можа за іх паручыцца. Таму некаторыя дэпутаты лічаць за лепшае, каб заклад маёмасці цалкам замяніў сабой паручыцельства. Прадстаўнікі банкаў у адзін голас кажуць, што адмаўляцца ад паручыцельства нельга. Інакш большасць насельніцтва проста не атрымае крэдыту. Наглядны прыклад прыводзіць **намеснік старшыні праўлення Белаграпрамбанка Генадзь СЫСОЕЎ**. Пазыка на аднапакаёўку, узятая на 20 гадоў пад 14%, будзе абыходзіцца недзе ў 1,4 млн штомесяц. «Значыць, заробак павінен быць 2,8 млн, каб узяць такі крэдыт», — заключае банкір. Сярэднестатыстычны беларус столькі не зарабляе, у нас вунь 500 долараў у эквіваленце — дасягненне... Паручыцельства ж дазваляе, каб такую суму складаў не адзін толькі заробак пазычальніка, а ўвесь сукупны прыбытак яго і блізкіх.

Сяргей Дубкоў разглядае паручыцельства і як дадатковы дысцыплінуючы фактар. Маўляў, адна справа «кіруць» банк, а зусім іншая — уласнага брата ці таварыша.

Яшчэ на адзін цікавы аспект звяртае ўвагу **дырэктар юрыдычнага дэпартамента Беларусбанка Сяргей КОЦКА**. Скажам, узяў чалавек пад заклад маёмасці пазыку ў 100 млн і застаўся вінен банку 1 млн. Несувымернасць такой сумы з коштам кватэры ў наяўнасці. Вось тут на дапамогу і прыйдзе паручыцельства, якое, на думку прадстаўніка Беларусбанка, павінна існаваць паралельна з іпатэкай. Знаходзіць ён і яшчэ адну калізію: пабудаванае на пазычаныя грошы жыллё запісваецца ў агульную ўласнасць сужэнцаў. У той час як пазычальнікам выступае толькі адзін. Сочыце за думкай? У выпадку нявыплат банк зможа спагнаць толькі палову кошту кватэры, другая адыдзе сужэнцу. Так што без паручыцельства зноў тупік.

Іпатэка і паручыцельства — не сінонімы, яны не могуць замяніць адно аднаго. Прыкладна так можна сфармуляваць аксіёму, якую хочуць перадаць абывацелям банкі.

КАЛІЗІЯ ЧАЦВЁРТАЯ: СТРАХАВАННЕ

Юлія АРЭШЧАНКА, намеснік гендырэктара Белдзяржстраха расказала пра тыповыя формы страхавання, якія практыкуюцца. Страхаванне, па-першае, аб'екта іпатэкі. Па-другое, жыцця і здароўя пазычальніка, а таксама рызыкі страты ім работы. Па-трэцяе, тытульнае страхаванне ці страхаванне права ўласнасці. Па-сутнасці, гэта страхаванне рызыкі незвароту. Перакладваць жа ўсе рызыкі з банкаў на сябе гэтаму зацікаўленаму боку не ўяўляецца мэтазгодным.

КАЛІЗІЯ ПЯТАЯ: ЭКАНАМІЧНАЯ

Эканамічную падаплёку іпатэчных калізій можна выразіць гэтак: дысбаланс актываў і пасываў. Укладны насельніцтва не затрымліваюцца ў банках даўжэй за тры гады ў сярэднім, і стаўка на іх — 16%. У той час як крэдыты выдаюцца на куды больш працяглыя тэрміны ды пад 14%. На думку намесніка міністра эканомікі Анатоля Філонава, праблему можна вырашыць часткова за кошт рэзерваў Нацбанка.

А пакуль яны спрачаюцца... людзі хочуць пабудаваць жыллё. І калі норма аб высяленні нарэшце актывізуе рынак, заахвоціць банкі, выкліча канкурэнцыю паміж імі, а ў перспектыве і патанненне такога жаданага і такога дарагога задавальнення, то яна павінна быць уведзеная. У канцы канцоў кожны ведае, на што ідзе. А рызыка, кажуць, справа высакародная, ды шампанскага без яе не п'юць...

Ала МАЧАЛАВА.

РАКАВАЯ РАСКОЛІНА

Два пажары ў Магілёўскай вобласці, якія адбыліся 2 лютага, звязаны з пячным ацяпленнем.

У Бабруйску 38-гадовы мужчына пакінуў на ноч адкрытыя дзверцы ў катле — з топкі выпалі вуглі і справакавалі пажар. У выніку гаспадар і яго 30-гадовая сяброўка вымушаны былі чакаць прыезду выратавальнікаў МНС у самым далёкім ад ачагу пажару пакоі, бо шляхі да выхаду адрэзалі дым і агонь. З суседніх кватэр з-за пагрозы задымлення давялося эвакуяваць людзей.

Тым жа вечарам, паведамілі ў Магілёўскім абласным УМНС, у пасёлку Татарка Асіповіцкага раёна 65-гадовая жанчына адчула пах дыму, які ішоў аднекуль з даху. Прычынай пажару, лічаць спецыялісты, стала расколіна ў дымаходзе. Ніхто не пацярпеў, але агнём часткова пашкоджаны дах і перакрыцці дома. Пажар адбыўся а 10-й гадзіне ўвечары. І добра, што не пазней, калі б усе жыхары дома, у тым ліку і 2-гадовае дзіця, ужо адпачывалі.

Ілона ІВАНОВА.

Абзац

◢ Электронныя табло з'явяцца сёлета на прыпынках грамадскага транспарту ў Мінску. КТУП «Мінскстранс» плануе ўстанавіць на прыпынках табло, якія будуць адлюстроўваць час да прыбыцця адзінак транспарту. Сёлета мяркуюць устанавіць 100-200 такіх табло — на праспектах і цэнтральных вуліцах. Усяго ў горадзе каля 2 тыс. прыпынкаў.

◢ **Рабочы Міёрскага мясакамбіната выкраў больш за 200 кг мясной прадукцыі. Вечарам супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі ў Міёрах аўтамашыну «Фальксваген-Вента» пад кіраваннем 36-гадовага работніка мясцовага мясакамбіната, які перавозіў 214 кг мясной прадукцыі. Падчас праверкі высветлілася, што мужчына, жыхар Міёраў, учыніў крадзеж днём з незачыненага памяшкання забойнага цэха прадпрыемства.**

◢ Трое мінчан скралі з будоўлі больш за кіламетр меднага кабелю. Супрацоўнікі Заводскага РУУС сталіцы затрымалі трох мінчан, якія маюць дачыненне да крадзяжу з будоўлі па вуліцы Ташкенцкай меднага кабелю і электраінструментаў. Скрадзенае ацэньваецца ў суму больш чым Br6 млн. Здабычу зламыснікі хацелі вывезці на машыне, але былі спынены супрацоўнікамі ДАІ для праверкі дакументаў. Заведзена справа.

Поўны абзац

◢ **Фінскага тэлевядучага звольнілі за глыток піва ў прамым эфіры. Калі Кіма Уілска закончыў чытанне падводкі да аднаго з сюжэтаў пра праверкі піцейных устаноў, на экране ўзнік відэарад са шклянкамі, што напаўняліся півам. У гэты час Кіма вырашыў павесяліць калег, што былі ў студыі, і сербануў піва з ёмістасці, якая стаяла ў яго пад сталом. Нечакана студыйная камера ўключылася, і вядоўца трапіў у кадр разам з бутэлькай. Ад нечаканасці ён праліў частку піва на сябе. Кіраўніцтва звольніла Кіма з працы. Між тым больш за 44 тыс. карыстальнікаў сайта FACEBOOK выказаліся ў яго падтрымку і асудзілі кіраўніцтва тэлеканала.**

◢ У Германіі мужчына экстранна спыніў цягнік з-за забытай валізкі з півам. Нецвярозы чалавек наладзіў на галоўным вакзале гарадка Кайзэрслаўтэрн пажарную трывогу з-за таго, што цягнік паехаў з яго піўным запасам. 44-гадовы немец, у крыві якога ўтрымлівалася 1,96 праміле алкаголю, і яго 28-гадовы сябар выйшлі пакурыць на платформу, пакінуўшы ў вагоне сумку з некалькімі бутэлькамі піва. Вагончык крануўся, перон застаўся. Каб састаў далёка не адышоў, адзін з аматараў піва выбіў шкло сістэмы ахоўна-пажарнай сігналізацыі, выклікаўшы пажарную каманду і аварыйныя машыны. Федэральная паліцыя пачала расследаванне з-за злоўжывання сігналам трывогі.

◢ **У Японіі зладзеі скралі больш за 700 тыс. прэзерватываў. Вытворцы ў шоку: каму спатрэбіўся цэлы грузавік «гумак»? Інцыдэнт адбыўся, калі грузавы аўтамабіль з грузам — 726 тыс. ультратонкіх прэзерватываў — ехаў з Малайзіі ў Японію. Калі грузавік прыехаў у пункт прызначэння, у Токіа, то аказалася, што ў кузаве нічога няма. Хто вінаваты ў крадзяжы, высветліць пакуль не ўдалося. У выніку фабрыка па вытворчасці гумавых вырабаў панесла страты на 120 млн ен (каля паўтара мільёна долараў).**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»

14 февраля 2011 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МАПИД», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205. Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, зал заседаний.

Начало работы собрания — 14 февраля 2011 года, 16.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Внесение изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205А, к. 2 **с 4 февраля по 13 февраля 2011 года, либо 14 февраля 2011 года** по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 14.00 до 15.30 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 4 февраля 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
• акционеру Общества — паспорт;
• представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100008115. **Администрация.**

«Прымусьце майго мужа дабудаваць дачу!»

НАВАТ такія дзіўныя звароты паступалі на «гарачую лінію» IV Усебеларускага народнага сходу. У гэтую ж катэгорыю можна аднесці скаргі на суседа па дачным участку, чые куры псуюць грады, але замест таго, каб абгарадзіць сваю тэрыторыю, незадаволены грамадзянін прасіў забараніць суседу трымаць курэй. Іншы скаржнік настойваў на забароне суседу трымаць пчол, якія залятаюць на яго ўчастак, гудзець і кусаюцца. Ніводзін зварот, дасланы на адрас народнага сходу, не застаўся без увагі, але большасць іх усё ж такі мела больш грунтоўныя падставы для разгляду.

Як паведаміў **начальнік аддзела пісьмаў і прыёму грамадзян Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Аляксандр КОЎШАР**, усяго на адрас IV Усебеларускага народнага сходу паступіла 1145 зваротаў, у тым ліку 835 — на «гарачую лінію», 253 тэлеграмы і 57 пісьмаў.

— Аналіз тэлефонных званкоў, пісьмаў і тэлеграм сведчыць аб высокай актыўнасці насельніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Коўшар. — Грамадзяне імкнуцца браць удзел у абмеркаванні і прыняцці рашэнняў па важнейшых кірунках сацыяльна-эканамічнага жыцця, яны неабыякавыя да лёсу нашай краіны.

Палова ўсіх зваротаў на адрас сходу паступіла ад пенсіянераў. Найбольшую актыўнасць праявілі жыхары сталіцы (466 зваротаў, ці 41 працэнт ад агульнай колькасці). У разрэзе рэгіёнаў актыўнасць жыхароў выглядала наступным чынам: Брэсцкая вобласць — 128 зваротаў, Віцебская — 75, Гомельская — 151, Гродзенская — 69, Мінская — 166, Магілёўская — 88, з-за мяжы краіны паступілі 2 звароты.

Паводле слоў Аляксандра Паўлавіча, аўтары шматлікіх зваротаў выказваліся ў падтрымку палітыкі, якая праводзіцца ў краіне, агучвалі словы ўдзячнасці кіраўніку дзяржавы за пастаянную ўвагу да патрэб людзей. Такія звароты на адрас Прэзідэнта паступілі з Мінска, Гомеля, Гродна, Жодзіна, Полацка, Слуцка, Лоеўскага раёна, Шумілінскага раёна і інш. Жыхар Гродна павіншаваў удзельнікаў сходу вершамі ўласнага сачынення:

Вітаю пасланцаў народнага сходу,
Вам планы жыцця
надалей будаваць,
Каб справы беларускага народу
Магутнасцю і здзымам маглі
ўсіх захапляць.

— *Неабходна скараціць продаж авечак, а летась гаспадарка прадала 663 ягняці і 293 авечкі. Матачнае пагалоўе трэба павялічыць удвая і давесці яго да 2,5 тысячы. Пабудаваць новую ферму, а затым думаць пра цэх. Нам ён патрэбен невялікі, а то шкада шкуры выкідваць. Вунь ляжыць штук 500, соллю пасыпаныя... Раней на Брэстчыне былі два прадпрыемствы па выдзелцы шкур, а сёння няма ніводнага.*

— Дык перспектыва ўсё ж ёсць?

— *Будуць грошы, падтрымаюць, то і перспектывы з'явяцца. Цяжка, што сёння ніхто не ведае, якой павінна быць ферма для авечак. Вось быў на вучобе, і там ніхто не мог нічога толкам наконт авечак растлумачыць. Страціць — лёгка, аднавіць — цяжка.*

А што думаюць у райвыканкаме? З гэтым пытаннем я звярнуўся да **начальніка ўпраўлення райсельгасхарчу Мікалая ВАРАЖУНА**.

— *У эканамічным плане авечкі для гаспадаркі стратныя, а ў сацыяльным — падтрымка для людзей, маладняк запатрабаваны прыватным сектарам. Насельніцтва хоча гадаваць авечак. А дзе можна набыць пародзістых, як не ў нашым раёне?*

— Але як выжыць сельгаскааператыву? Узяць крэдыт і аднаўляць пагалоўе?

— *Банк крэдыты СВК «Канюхі» не дае. І тут, на мой погляд, трэба паралельна з авечкамі развіваць другую галіну — гадаваць цялушак. Бычкі ў іх ёсць, але яны стратныя.*

— Авечкі стратныя, бычкі стратныя, то можа прадаць гаспадарку з аўкцыёну?

— *Ахвотныя былі набыць... за адну базавую, каб затым усіх авечак паціху на шашлыкі пусціць. Хочаце купіць, то плаціце рэальную цану і працуйце.*

Успомнім, што пры М. Хрушчову кукуруза не прыжылася ў Беларусі і служыла тэмай для анекдотаў. А сёння ніводная гаспадарка без кукурузы не можа абысціся. Значыць, справа была не ў гэтай сельгаскультуры, а ў нас. Вось гэтаксама і з авечкамі. Неабходна пераймаць замежны вопыт, улічваць айчынныя напрацоўкі мінулых гадоў... Авечкі не могуць быць стратнымі!

А можа, не ўсё так і кепска. Прайшла інфармацыя, што ў адпаведнасці з распрацаваным бізнэс-планам у Лагойскім раёне плануецца будаўніцтва авечкагадоўчага комплексу на 10 тысяч галоў адначасовага ўтрымання. Калі праект ажыццявіцца, то гэта будзе прарыў для авечкагадоўлі ў цэлым. Праўда, многае залежыць ад замежных інвестыцый.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Пародa тэксель.

Спажывец

А ЎБАЧЫШ ТАБЛІЧКУ Ў ХАЛАДЗІЛЬНІКУ — НЕ ЗДЫМАЙ

Яе захаванасць з'яўляецца адной з умоў гарантыі на набыты тавар у выпадку паломкі

Упошні час у Міністэрства гандлю пачалі паступаць звароты спажыўцоў, якім адмаўляюць у правядзенні сэрвіснага і гарантыйнага абслугоўвання тэхнічна складанага тавару, у прыватнасці, халадзільнікаў гандлёвай маркі «Індэзіт», а таксама ў задавальненні іншых іх законных патрабаванняў — замены, вяртання няякаснага тавару. Прычына — адсутнасць на вышэйназваным тавары наклеек (таблічак) вытворцы ў выглядзе штрых-кода з указаннем мадэлі, серыйнага і індустрыяльнага нумара, а таксама іншых тэхнічных паказчыкаў вырабу. Чым гэта выклікана і хто ў згаданай сітуацыі мае рацыю? У гэтым паспрабаваў разабрацца журналіст «Звязды».

Як высветлілася, па звестках прадаўцоў, рамонтных арганізацый, для задавальнення патрабаванняў па абмене і вяртанні няякаснага тавару — халадзільнікаў гандлёвай маркі «Індэзіт» — патрабуецца дазвол вытворцы (ЗАТ «Індэзіт Інтэрнэйншл»), які выдаецца на падставе прадастаўленай дакументацыі ў суправаджэнні фота недахопаў і наклейкі (таблічкі) вытворцы ў выглядзе штрых-кода на вырабе.

— У адпаведнасці з артыкулам 7 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2002 года «Аб абароне правоў спажыўцоў», вытворца — прадавец, пастаўшчык, прадстаўнік — абавязаны своечасова прадастаўляць спажыўцу неабходную і праўдзівую інфармацыю адносна прапанаваных тавараў, якая ў абавязковым парадку павінна ўтрымліваць штрыхавы ідэнтыфікацыйны код і іншыя звесткі, якія прадастаўляюцца па просьбе спажыўца, — паведаміла нам кансультант управлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Антаніна Палякова. — У адпаведнасці з Інструкцыяй па эксплуатацыі на халадзільнікі гандлёвай маркі «Індэзіт» (раздзел «Умовы гарантыі»), што даецца ў камплекце адначасова з таварам, «гарантыі вытворцы не распаўсюджваюцца на вырабы з выдаленымі ці сапсаванымі таблічкамі, якія ўтрымліваюць ідэнтыфікацыйны і серыйны нумар вырабу». Такім чынам, вытворца халадзільнікаў прадаставіў спажыўцу поўную і праўдзівую інфармацыю, папярэдзіўшы, што адной з умоў гарантыі з'яўляецца захаванасць таблічак, якія ўтрымліваюць згаданыя нумары вырабу. Іншымі словамі, пакупнікам трэба ўважліва чытаць Інструкцыю, чаго, на жаль, некаторыя людзі не робяць.

Як распавяла далей Антаніна Васільеўна, насамрэч такіх зваротаў у Міністэрства гандлю ад незадаволеных спажыўцоў не так і шмат і датычацца яна выключна прадукцыі «Індэзіт» расійскага паходжання. Тлумачэнні ў пэўным сэнсе даюцца, скажам так, на апярэджанне. Бо, напрыклад, па інфармацыі нашага «Атланта», гэтае прадпрыемства не адмовіцца правесці сэрвіснае і гарантыйнае абслугоўванне сваёй прадукцыі, нават калі на ёй будзе адсутнічаць згаданая маркіроўка.

— Калі гаварыць пра наклейкі (таблічкі) з ідэнтыфікацыйнай інфармацыяй на расійскіх «Індэзітах», дык яны размешчаны ўнутры халадзільнай камеры ў раёне скрыняў для гародніны і звонку халадзільніка ў ніжняй частцы вонкавых бакавых сценак. Магчыма, гэтыя месцы не самыя ўдалыя. Наклейкі там некалькі псуюць эстэтычны выгляд халадзільніка, і гаспадары, не задумваючыся аб магчымых наступствах, проста выдаляюць іх. Аднак паўтарусь: трэба ўважліва чытаць інструкцыю, — сказала далей Антаніна Палякова.

Нехта са спажыўцоў можа спытаць: няўжо гэтыя таблічкі такія важныя? Нават калі іх і няма, бачна ж, якога вытворцы гэты халадзільнік. Але тут усё часам можа быць не так проста. Пра гэта нам распавёў майстар, які займаецца гарантыйным абслугоўваннем і рамонтам халадзільнікаў у сталіцы. У абмен на шчырасць аповеду рэдакцыя не будзе называць ні месца працы чалавека, ні яго сапраўднае імя. Назавём нашага суразмоўцу Максам.

— Халадзільнікі замежных марак увогуле могуць выходзіць са строю як падчас гарантыйнага тэрміну, так і пасля яго. Паломкі таксама бываюць рознымі. Часам кошт рамонту можа вылівацца ў прыстойную суму, або за адносна невялікі прамежак часу майстра даводзіцца выклікаць не адзін раз. Іншаму спажыўцу прасцей набыць новы халадзільнік, чым рамантаваць той, што выйшаў са строю. Куды падзець гараджаніну ўжо непатрэбны агрэгат? Або — да пад'езду, або — прапанаваць (бясплатна, з удзячнасцю за пазбаўленне ад клопатаў па яго выкідванні, ці за сімвалічную суму) любому ахвотнаму па аб'яве. Ці хоць таму ж майстру. І вось такія «майстры» потым недзе ў гаражы з некалькіх зламаных халадзільнікаў робяць адзін. Вонкава ён можа выглядаць як абсалютна новы. Потым агрэгат будзе прапанаваны па тых жа аб'явах ахвотным па меншай, чым у крамах, цане. Асабліваснцю такой «адноўленай» складаная бытавой тэхнікі будзе: па-першае, адсутнасць на яе дакументаў (кіраўніцтва па карыстанні, тэхнічнага пашпарта); па-другое, адсутнасць (каб не было ніякіх слядоў) тых самых наклеек і таблічак, — распавёў Макс. — І з чым пры выкарыстанні такога халадзільніка ў перспектыве рызыкуе сутыкнуцца яго новы ўладальнік? Калі здараецца паломка, ён, безумоўна, звяртаецца ў афіцыйныя сэрвісныя цэнтры. Прыязджае майстар. Дакументы на агрэгат яму не вельмі патрэбныя: перш за ўсё ён шукае тыя самыя ідэнтыфікацыйныя таблічкі, інфармацыю з якіх уводзіць у базу звестак. А інфармацыі пра халадзільнік няма, што ставіць пад сумненне яго паходжанне. Ці іншы варыянт. Не выключана, што якінебудзь халадзільны агрэгат трапляе ў краіну нелегальным шляхам. Нешта з ім здарылася, гаспадары выклікалі майстроў з сэрвісу. Тыя прыехалі, «прабілі» па базе нумар вырабу і высветлілі, што ў краіну гэты халадзільнік афіцыйна не ўвозіўся. Нават калі гаспадары пагодзяцца з гэтым і, не прэтэндуючы на бясплатнае гарантыйнае абслугоўванне, прапануюць майстру за грошы выправіць паломку, наўрад ці ён на гэта пойдзе.

Падаецца, апошняя думка толькі яшчэ раз пацвярджае словы папярэдняга суразмоўцы пра тое, што «Атлант» возьмецца за сэрвіснае і гарантыйнае абслугоўванне халадзільніка нават пры адсутнасці таблічак з нумарам вырабу: зразумела, што агрэгат выраблены ў нашай краіне. Таму напрыканцы пакупнікам складаная бытавой тэхнікі застаецца толькі яшчэ раз нагадаць банальную, але, як высвятляецца зноў, карысную параду — заўсёды ўважліва вывучайце ўсе дакументы. Каб не патрапіць у непрыемную сітуацыю. Хоць, падаецца, і самім вытворцам (гэта не толькі пра канкрэтную сітуацыю, а ўвогуле, карыстаючыся выпадкам) трэба не толькі прадастаўляць неабходную і дакладную інфармацыю адносна тавару, але і паклапаціцца пра размяшчэнне таблічак з тэхнічнымі паказчыкамі вырабу ў такіх месцах, дзе яны будуць даступнымі для спецыялістаў па абслугоўванні ці рамонце, але і не будуць псаваць знешні выгляд прадукцыі. Думаецца, многім разпораз даводзілася асцярожна выдаляць з таго ці іншага тавару лагатып на клейкай аснове, папераджальныя надпісы, якія або вытворца, або пастаўшчык ці прадавец «ляпілі» на самым відным месцы, баючыся пры гэтым сапсаваць знешні выгляд пакупкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Запрашальнік

«Дзённік» Маера, «Нёман» Увэ і аўтограф Катрын Шміт

Германія — ганаровы госць Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу 2011

Каля 600 экспанентаў чакаецца сёлета на міжнароднай кніжнай выставе ў Мінску. За чатыры дні арганізатары чакаюць больш за 50 тысяч наведвальнікаў. Ганаровым госцем сёлета стане Германія.

— Запрашэнне стаць ганаровым госцем кніжнай выставы мы прынялі з задавальненнем, — гаворыць **намеснік кіраўніка місіі пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія Петэр Дэтмар**. — Гэты статус будзе стымулам для паўтарэння мінулагодняга поспеху Францыі, якая была госцем выставы летась.

— Госць на кніжнай выставе — сусветная практыка, — гаворыць **выканаўчы дырэктар XVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу Дзмітрый Макараў**. — У наступным годзе такім госцем стане Венесуэла, у 2013 — Іран. Налета, акрамя асноўнага госця, будзе і дадатковы — Арменія (500 гадоў споўніцца з моманту выхаду першай кнігі на армянскай мове). Сёлета такім госцем стала Германія —лідар не толькі ў галіне выдавецкай кніг, але і паліграфічнага абсталявання.

Дэвіз нямецкага стэнда — «Германія: багацце колераў і фарбаў». За чатыры дні на ім будзе прадстаўлена больш за 700 кніг з 250 выдавецтваў. Цэнтральнай часткай стэнда стане падборка кніг на тэму экалагічнай архітэктуры «Сонечныя перспектывы. Сённяшні дзень зялёнай архітэктуры».

Нумар стэнда — D8

Парадуе нямецкі стэнд перш за ўсё літаратурных гурманаў. Тут будуць прэзентаваны літаратурныя навінкі Германіі за 2010 год, падборка кніг Герты Мюлер, якая два гады таму атрымала Нобелеўскую прэмію, а таксама прэзентацыя кніг лаўрэатаў кніжных прэмій Катрын Шміт (Нямецкая кніжная прэмія-2009) і Клеменса Маера (Лейпцыгская кніжная прэмія-2009). Клеменс Маер зачытае ўрывак са сваёй кнігі «Гвалты. Дзённік». Катрын Шміт прэзентуе кнігу «Ты не памрэш», пераклад якой выканаў Альгерд Бахарэвіч. Як абяцаюць арганізатары кніжнай выставы, паступова на беларускую мову будуць перакладзены творы ўсіх аўтараў, уладальнікаў Нямецкай кніжнай прэміі, якую штогод прысуджае літаратарам Саюз кнігавыдаўцоў Германіі.

Адным з гасцей стэнда стане таксама аўтар і рэдактар Уве Рада, які прадставіць сваю кнігу «Галасы Панямоння — гісторыя, культура, лёсы аднаго культурнага абшару». Кніга расказвае пра каралеву Луізу і Напалеона, ВКЛ і Панямонне, пра апошні ў Еўропе некрануты лес і пра прыгажосць Куршскай касы.

У дадатак ля нямецкага стэнда будуць размешчаны дзве кніжныя крамы. У адной плануецца прадаваць розныя кнігі на нямецкай мове, а ў другой — кнігі пра Германію на беларускай і рускай мовах.

Адмысловая праграма чакае і дзяцей. У адзін з дзён выставы нямецкі стэнд арганізуе адмысловыя майстар-класы пад назвай «Як намаляваць мультфільм» пад кіраўніцтвам мастачкі Сюзаны Смаіч. Стэнд зойме плошчу ў 250 квадратных метраў (нумар стэнда — D8).

Як зазначае нямецкі бок, усе кнігі, прадстаўленыя на нямецкім стэндзе сёлета, у Беларусі і застануцца. Паводле слоў Петэра Дэтмара, пасля таго, як выстава скончыцца, іх перададуць у бібліятэкі альбо іншыя ўстановы Беларусі.

Ілья ЛАПАТО.

РЕКЛАМНАЯ ИГРА

«Счастливый ски-пасс Логойска»

В Горнолыжном спортивно-оздоровительном комплексе «Логойск» проводится рекламная игра «Счастливый ски-пасс Логойска». **Начало рекламной игры — 3 февраля 2011 года, окончание – 10 мая.**

Участвовать в рекламной игре «Счастливый ски-пасс Логойска» может любой посетитель комплекса, который приобретет специальный билет (любого тарифа) на бугельный подъемник и канатную дорогу. Обязательное условие: «счастливыми» могут стать только те ски-пасы, которые куплены в будний день в период с 3 февраля и по 31 марта.

Призовой фонд рекламной игры состоит из десяти призовых сертификатов на сумму 250 000, 150 000 и 100 000 белорусских рублей. Общая сумма призового фонда один миллион четыреста тысяч белорусских рублей.

На сумму, указанную в призовом сертификате, победители рекламной игры до 31 мая могут приобрести спортивные товары в магазине «ROSSIGNOL» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 117 а. Возможность получения денежной суммы, эквивалентной призовому сертификату, не предусматривается. Призовые сертификаты предоставлены партнером ГСОК «Логойск» ЧУП «Альпика-спорт».

Призовой фонд будет разыгрываться на территории ГСОК «Логойск» в здании пункта проката горнолыжного снаряжения 8 марта (участвуют ски-пасы, приобретенные в период с 3 февраля по 7 марта) и 2 апреля (участвуют ски-пасы, приобретенные в период с 9 марта по 31 марта) ровно в 15.00. За соблюдением правил розыгрыша наблюдает специальная комиссия. В первом туре каждого розыгрыша разыгрываются три сертификата номиналом 100 000 бел. руб. Во втором туре – один сертификат номиналом 150 000 бел. руб. В третьем туре – один сертификат номиналом 250 000 бел. руб.

Список победителей (номера выигравших ски-пассов) будет опубликован в газете «Звязда» от 5 апреля 2011 года и на официальном сайте ГСОК «Логойск» www.logoisk.by. Забрать призовой сертификат можно до 30 апреля в здании пункта проката комплекса, предъявив оригинал выигрывавшего ски-пасса и паспорт.

Результаты рекламной игры «Счастливый ски-пасс Логойска» будут опубликованы в газете «Звязда» от 10.05.2011 и на официальном сайте ГСОК «Логойск». Информацию можно получить и по телефонам: **8(01774)53795, 8(01774) 53797.**

Свидетельство № 1845 от 01.02.2011 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь. УНП 601027788.

15.02.2011 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Татьяна».

Повестка дня:

1. О создании Обществом унитарного предприятия.
2. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Павлова, 26.

Начало регистрации участников собрания: 15.30.

УНП 400068248

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

16 февраля 2011 года **повторно проводит открытый** *аукцион* **на право заключения договора аренды земельного участка в Минском районе**

		Лот 1
1	Адрес земельного участка	Минский район, Боровлянский с/с, д. Слободщина
2	Кадастровый номер	623680608101000084
3	Площадь земельного участка	0,1257 га
4	Срок аренды (лет)	99
5	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома
6	Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей)	–
7	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 665 539
8	Начальная цена права заключения договора аренды	2 869 долларов США
9	Задаток (рублей)	800 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **16.02.2011 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **10.02.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600052345.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

«МАЗ» СУПРАЦЬ ЭКСКАВАТАРА

2 лютага ўдзень у Чавускім раёне «МАЗ», які перавозіў малако, на аўтадарозе Чавусы — Рабавічы сутыкнуўся з экскаватарам. Гэты экскаватар знаходзіўся на паласе руху, таму што выпаў з платформы іншага «МАЗа». У выніку ДТЗ вадзіцель малакавоза, 53-гадовы жыхар Слаўгарадскага раёна, памёр на месцы.

Фота прадастаўлена Магілёўскай ДАІ.

Уцекачы за рулём, альбо ДАІ вас дагоніць

У Магілёўскай вобласці адбыліся 3 аўтамабільныя аварыі, у якіх загінулі людзі, а вадзіцелі збеглі з месца здарэння.

28 студзеня каля 2-й гадзіны ў Быхаўскім раёне паблізу вёскі Весць 38-гадовы магіляўчанін на аўтамабілі «Мерседэс» наехаў на 53-гадовага вяскоўца, які ішоў па краі дарогі. Пешаход загінуў, а вадзіцеля, які збег з месца здарэння, праз суткі затрымалі.

29 студзеня ўвечары ў Клімавічах 26-гадовы мясцовы жыхар на аўтамабілі «Фальксваген Гольф» наехаў на 59-гадовую жанчыну на абочыне дарогі. Яна ад атрыманых траўмаў памерла, а кіроўца тэрмінова пакінуў месца аварыі. На наступны дзень супрацоўнікі міліцыі знайшлі аўтамабіль і затрымалі вадзіцеля.

Абодва затрыманыя вадзіцелі сказалі, што яны проста спужаліся, а таму і збеглі з месца дарожна-транспартнага здарэння. Між тым, трэба ведаць, што той, хто пакінуў месца ДТЗ і чалавека ў небяспечнай для жыцця сітуацыі, аўтаматычна становіцца злачынцам. Яму давядзецца адказваць паводле Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае пакаранне ад выканаўчых работ да пазбаўлення волі на тэрмін да 3-х гадоў.

30 студзеня каля 19 гадзін у Бялынічах аўтамабіль наехаў на 61-гадовага мясцовага жыхара. Мужчына атрымаў цяжкія траўмы, ад якіх памёр у бальніцы праз некалькі гадзін. Аўтамабіль знайшлі на наступны дзень, але вадзіцель пакуль хаваецца ад міліцыі.

Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі **начальнік УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл НЕЎМЯРЖЫЦКІ**. Ён папрасіў садзейнічання сродкаў масавай інфармацыі ў справе інфармавання вадзіцеляў аб адказнасці за пакіданне месца аварыі.

— У нас ёсць усе магчымасці для раскрыцця такіх здарэнняў, і звычайна мы знаходзім вадзіцеляў, якія збеглі, ужо на наступны дзень, — зазначыў Міхаіл Неўмяржыцкі. — Навошта бегчы ад адказнасці за свае ўчынкі? Гэта робіць толькі больш цяжкім пакаранне — і крымінальнае, і маральнае таксама. Таму трэба спыніцца, аказаць чалавеку першую дапамогу, тэрмінова выклікаць медыкаў. У такім выпадку чалавеку можна захаваць жыццё, і выхад аварыі можа быць зусім іншы.

Летась, паводле статыстыкі Магілёўскай ДАІ, вадзіцелі збягалі з месцаў здарэння 92 разы. У выніку гэтых дарожна-транспартных здарэнняў загінулі 11 чалавек, а 88 атрымалі траўмы.

Ілона ІВАНОВА.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *16 февраля 2011 г.* **повторно проводит открытый** *аукцион* **по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5	Лот 6
1	Адрес земельного участка	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 77	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 83	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 294	Михановичский с/с, п. Михановичи	Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 138	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 340
2	Кадастровый номер	623680602601000846	623680602601000864	623680602601000858	623684204601001307	623686304601000539	623687508101001035
3	Площадь земельного участка	0,1489 га	0,1497 га	0,1492 га	0,1179 га	0,1516 га	0,1333 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 320 260	1 435 360	1 435 360	1 285 510	880 187	84 000
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	95 000 000	96 000 000	95 000 000	22 000 000	16 000 000	14 000 000
7	Задаток (рублей)	9 500 000	9 500 000	9 500 000	2 200 000	1 600 000	1 400 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **16.02.2011 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **10.02.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лот 4 – на расчетный счет № 3600621090116 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лот 5 – на расчетный счет № 3600621150173 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лот 6 – на расчетный счет № 3600621170195 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Бернд ШТАНГЕ:

«НАКОНТ КАРНІЛЕНКІ Я ЗАСТАЮСЯ ПРЫ СВАІМ МЕРКАВАННІ»

Кантракт з «Блэкпулам» трэнер назваў сенсацыяй, але ад папярэдніх крытычных ацэнак футбаліста не адмовіўся

Фота Пятра ФАМІНА.

— Месяц я правёў у адпачынку, тры тыдні — у Катары на Кубку Азіі, а зараз нас чакае гульня ў Анталі, — пахваліўся ўчора перад журналістамі Бернд Штанге. Беларускі футбол пачынае выходзіць з адпачынку, і матч у Турцыі супраць зборнай Казахстана 9 лютага — першы ў новым сезоне, у якім нас і нашу зборную чакае працяг адборачнага шляху на Еўра-2012. Нагадаем, што ў групе Е Беларусь займае пакуль 2-е месца, на адно очко адстаючы ад каманды Францыі.

— Мы спецыяльна абралі ў супернікі Казахстан. Па-першае, кіраваліся эканамічнымі падыходамі. Па-другое, гульцы толькі рыхтуюцца да новага сезону, і ў Анталіі мы згуляем тэставы матч. Згодна з рэгламентам ФІФА ў нас будзе 48 гадзін — гэта мінімальны час, які мы пастараемся выкарыстаць аптымальна. Наша задача — зрабіць моцную каманду на сёлетні сезон. Мы хочам выйграць у Албаніі, а пасля нас чакаюць тры хатнія гульні. На гэтым этапе і вырашыцца, наколькі мы цудоўныя. Я чуў шмат крытыкі наконт выбару цяперашняга суперніка. Маўляў, чаму нельга было згуляць з Аргенцінай, Бразіліяй, Англіяй? Але 9 лютага — няўдалы час для гульні з моцным супернікам. Ды ў гэты час і складана адхапіць моцнага працаўніка. Мы доўга кантактавалі са зборнай Расіі, але яны ўрэшце адмовіліся, выбраўшы больш слабую каманду, — растлумачыў Бернд Штанге свой выбар.

Задачы на гэты матч таксама простыя. Першая — дасягнуць станоўчага выніку.

— Любяць журналісты і балельшчыкі галоўнага трэнера ці не, але галоўным лічыцца вынік. Другая наша задача — стварыць, палепшыць каманду. І для гэтага мы выкарыстаем кожную хвіліну з 48 гадзін, якія ў нас будуць.

Бернд Штанге пацвердзіў, што праблем у гульцоў, а адпаведна і ў трэнера, хапае:

— У Кульчыя, які год таму быў гульцом года ў Беларусі, сёння няма клуба. І цяпер узнікае пытанне, у якой ён форме? З Кутузавым тое самае: у якой ён форме, што ў яго з клубам? У якой форме Юрый Жаўноў, найважнейшы для нас гулец? Хто заменіць Калачова, які не можа гуляць з-за перабору картак? Калі вернецца ў каманду Сяргей Карніленка? — на гэтыя пытанні і сам галоўны трэнер пакуль не ведае адказаў. Будзем спадзявацца, што збор у Турцыі ўнясе хоць якую-небудзь яснасць.

Пытанне Сяргея Карніленкі надзвычай цікавіла журналістаў. Як вядома, днямі нападаючы падпісаў кантракт з клубам англійскай прэм'ер-лігі «Блэкпул». Падзея зусім не радавая для нашага футбола, дзе і кантракт з расійскай прэм'ер-лігай лічыцца поспехам. У той жа час яшчэ пару месяцаў таму Сяргей Карніленка быў няшчадна крытыкаваны Берндам Штанге. «Назавіце мне за апошнія 15 месяцаў хоць адзін матч, які цудоўна правёў Карніленка?» Магчыма, крытыка была несправядлівай, спыталі ў Штанге.

— Найперш я крытыкаваў яго за чырвоную картку. Калі гулец атрымлівае чырвоную картку ў гульні з Люксембургам, яго трэба крытыкаваць. Цяпер ён вымушаны тры матчы адсутнічаць. Тое, што ён атрымаў у Англіі кантракт, — гэта сенсацыя. Там увогуле 5 ці 6 выхадцаў з постсавецкай прасторы. Гэта самая цікавая ліга. Калі яму ўдасца там замацавацца, гэта будзе выдатна. Я ўчора з ім размаўляў і сказаў, чаго чакаю ад яго, даў некалькі рэкамендацый наконт прэм'ер-лігі. У нас усё з Карніленкам чыста і адкрыта, ніякай праблемы няма.

І калі трэнер «Блэкпула» лічыць, што Карніленка — супергулец, я рады, што ён атрымаў такі кантракт. Я спытаў у Сяргея, чаму ён не гуляў у «Рубіне». Там занадта шмат легіянераў. Але іншыя легіянеры застаюцца, а Карніленка чамусьці выпадае. Я застаюся пры сваім меркаванні наконт Сяргея. Яму 28 гадоў, самы футбольны ўзрост. Калі можа штосьці паказаць, няхай пакажа. У нас з нападаючымі ў камандзе складана. Ёсць Радзівонаў, а дзе астатнія? Я шчаслівы, што ў Карніленкі ёсць гэты кантракт, я да яго не маю ніякага дачынення, я яго туды не пасылаў. І я лічу, што меў права крытыкаваць яго, — рэзюмаваў Штанге.

Ці ўдасца замацавацца ў «Блэкпуле» Сяргею Карніленку, дзе і без яго з дзясятак нападаючых, — пытанне, на якое адкажа час. А вось у іншага нашага прадстаўніка ў англійскай прэм'ер-лізе, Аляксандра Глеба, справы пакуль не вельмі. У апошнім матчы свайго клуба на поле ён не выходзіў. Бернд Штанге пракаментаваў сітуацыю:

— Я з калегам наведваў «Бірмінгем», размаўляў з Глебам, з трэнерам Маклішам. Трэнер сказаў, што Глеб не ў добрай фізічнай форме. І Аляксандр сам гэта пацвердзіў. Ён папрасіў не браць яго ў Аман, хацеў больш патрэніравацца там. Ён сапраўды мала гуляе. Я дагэтуль веру, што ён можа нам дапамагчы. Але калі будзе ў добрай форме. Я бачыў гульні «Бірмінгема» — яны іншыя, чым у «Барселоны» ці «Арсенала». Каманда выкарыстоўвае доўгія, высокія перадачы. Там гульцы з ростам 1,98 ці 2,03. А Глеб стаіць у цэнтры поля і хоча атрымаць мяч... Але я спадзяюся, што ён прыедзе ў стан зборнай у добрым настроі.

Расказаў Бернд Штанге і пра перспектывы астатніх гульцоў у зборнай на гэты сезон, узгадаўшы таксама Філіпа Рудзіка, цяперашняга гульца БАТЭ, за якога яго калісьці крытыкавалі:

— Віталь Булыга — прыемны, старанны футбаліст. Хоць апошнім часам ён знік у першай расійскай лізе з нашага поля зроку. Ён не надта добра выглядаў у БАТЭ, але зараз ёсць сігналы, што ён добра гуляе. У яго вялікае сэрца, як і ў Карніленкі, яны жывуць для Беларусі. Карніленка адмовіўся ад расійскага пашпарта, і гэта запала мне ў сэрца. У нас 25-26 кандыдатаў у каманду на гэты год. У нас з'явіцца Жаўнерчык, Бычанок. Пару гадоў таму, калі я выклікаў у зборную Рудзіка, мяне крытыкавалі і пыталі, адкуль гэты Рудзік. А ўчора Віктар Ганчарэнка мне сказаў, што Філіп надзвычай добра гуляе ў футбол. Так што нашы дзверы ў зборную адчыненыя, важна толькі, каб захоўваўся дух і дысцыпліна.

І напрыканцы Бернд Штанге расказаў пра прыемнае — тры тыдні ён правёў на Кубку Азіі ў Катары і нават каментаваў матчы для аднаго з каналаў:

— Я ўпершыню быў вашым калегам. Гэта выдатна — я 90 хвілін гаварыў пра футбол, расказваў што добра, што дрэнна, каго б я замяніў і чаму гэтага не робіць трэнер. Ведаеце, наша каманда была б у фінале. Там толькі 2-3 нядрэнныя зборныя — Карэйская Рэспубліка, Японія і Аўстралія. Ну, магчыма, Іран і Ірак. Усе астатнія так сабе. Дзіўна, што столькі грошай і такі слабы футбол...

Алена АЎЧЫННІКАВА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Дысплей. Аватар. Кязей. Зебра. Шпат. Маркес. Лідэр. Гаўк. Арк. Цэн. Долар. Грыб. Кат. Стан. Сяк. Вагон. Чалка. Дуэт. Сякера. Цыліндр. Ваўк. Адлога. Кумпяк. Барабіст. Авал. Зра. Яд. Пламазан. Чаргаванне. Тэкст. Апрала. Снайпер. Гер. Аск. Перыяд. Тор. Сіла. Лад. Рым. Сарк. Фільтр. Ваз. Анкера. Арэна. Лангедак.

РЭЙСЫ БУДУЦЬ ВЫКОНВАЦЦА СУМЕСНА

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ авіякампаніі Беларусі і Азербайджана — «Белавія» і «АЗАЛ» — падпісалі пагадненне аб сумесным эксплуатацыі авіялініі Мінск — Баку. Дагэтуль «Белавія» эксплуатавала яе самастойна, а з 6 лютага пачнецца сумеснае выкананне рэйсаў.

У рамках пагаднення аператарам на лініі будзе «Белавія», а яе маркетынгавым партнёрам — «АЗАЛ». У зімовым раскладзе 2010—2011 гадоў «Белавія» выконвае прамыя рэгулярныя рэйсы па маршруце Мінск — Баку два разы на тыдзень — па чацвяргах і нядзелях (час палёту складае 3 гадзіны 25 хвілін). Гэты графік пакуль захаваецца, а з пачаткам летняга сезона частата выканання рэйсаў павялічыцца да трох у тыдзень. Па інфармацыі прэс-службы «Белавія», аб'яднанне дзвюх авіякампаній створыць дадатковыя ўмовы пасажырам абодвух перавозчыкаў для падарожжаў транзітам праз Мінск і Баку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 17

Белыя: Крg1, Фе8, Ла1, Лd1, Cd2, Кс4, пп. b2, c3, d4 (9).

Чорныя: Крh7, Лh2, Cf3, Cg3, пп. c6, g7, h6 (7).

Ход белых.

Заданне № 18



Белыя: Крg5, Кe3, п. h5 (3).

Чорныя: Крg1, Кd1, п. f2 (3).

Ход белых.

КАМАНДНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ СВЕТУ ПА ШАХМАТНАЙ КАМПАЗІЦЫІ

(Працяг. Пачатак у нумары за 29.01 г.г.)

ЗАДАЧЫ НА КААПЕРАТЫЎНЫ МАТ ЗА 3 ХАДЫ

Тэма. У кожнай фазе задачы на кааператыўны мат за 3 хады чорная фігура (або пешка) можа быць гіпатэтычна аддалена з дошкі замест хода на канкрэтнае поле (тэматычны ход) і тое ж самае рашэнне або варыянт ілюзорнай гульні праходзіла б і ў гэтым выпадку. Тэматычны ход не павінен быць адзіным магчымым ходам гэтай фігуры. Ён таксама не можа з'яўляцца тэмпаходам.

Калі ў адну фазу ўключаны хады розных фігур, кожны такі ход павінен задаволіць апісаным вышэй умовам незалежна ад астатніх. Для кожнай тэматычнай фігуры толькі яе адзін ход у канкрэтнай фазе можа разглядацца як тэматычны. Патрабуецца як мінімум дзве тэматычныя фазы. Ілюзорная гульня, некалькі рашэнняў і блізняты дазволены: дуплекс, блізняты польскага тыпу і 0-пазіцыі не дазволены. Прыклад: В. Чапіжны, 2007 г. **Белыя:** Крg8, Лf8, Кс8, Са6, пп. c3, c5, d6 (7). **Чорныя:** Крe3, Фе4, Лс4, Лe1, Cf5, Кg5, пп. c6, d2, d7, e5, g2, g4 (12) b) g4→c2. **Рашэнне:** а) 1. Фb1 Ке7 2. Сс2 Лf1 3. Лe4 Kf5x b) 1. Фh4 Kb6 2. Лg4 Cf1 3. Се4 Кс4x.

ЗАДАЧЫ НА ЗВАРОТНЫ МАТ ЗА 3—5 ХАДОЎ

Тэма. У зваротным мае за 3—5 хадоў чорныя абараняюцца ад пагрозы, перакрываючы лінію для чорнай фігуры, якая аб'яўляе мат у пагрозе. Магчыма папярэдняе або замаскіраванае перакрыццё. У якасці тэматычнай лініі можа выступаць як тая, па якой чорная фігура робіць ход, так і тая, па якой яна атакуе белага караля. Перакрытая фігура тым не менш павінна гуляць нейкую ролю ў тэматычных варыянтах. **Прыклад:** А. Ажусін, 2002 г. **Белыя:** Крe5, Фb2, Лd6, Лf2, Са6, Се1, Кс3, Кh1 (8). **Чорныя:** Крd3, Фh5, Лh6, Cf5, Кd5, Кg8, пп. e6, f7, g5, g6, h3 (11). Мат за 4 хады.

Рашэнне: 1. Фb4! (2. Kb2+ Крe3 3. Kd1+ Ф:d1 4. Фd4x. Фd4x, 1... Cg4 2. Kb6+ Крe3 3. K:d5+ e:d5 4. Фf4+ g:f4x, 1... g4 2. Ка3+ Крe3 3. Фf4+ K:f4 4. Кс2+ С:с2х, 1... Фе2+ 2. Ке3+ Кр:е3 3. Cd2+ Ф:d2 4. Фd4+ Ф:d4x).

КАЗАЧНЫЯ ЗАДАЧЫ

Тэма. У задачы на зваротна-кааператыўны мат за 2—4 хады павінны быць паказаны антыбатарэйныя крытычныя хады кітайскай фігуры (Leo, Pao, Vao, Nao). Ілюзорная гульня, некалькі рашэнняў і блізняты дазволены: дуплекс, блізняты польскага тыпу і 0-пазіцыі не дазволены.

Прыклад: Г. Рэм, 2010 г. Белыя: Крg5, Pao d3, Сс8, пп. c3, c4, g2, h4 (7).

Чорныя: Крe4, Лf1, PAO h6, пп. b7, e5, h5 (6). Мат за 3 хады.

Рашэнне: 1. PAO h3 PAO a6 2. g3 b6 3. Cf5+ Л:f5x.

PAO — кітайская ладдзя, ходзіць як звычайная ладдзя, але б'е, рухаючы па лініі ладдзі праз другую фігуру любога колеру (перашкоды), на любое поле пасля яе пры ўмове, што на гэтай лініі няма іншых перашкод.

Да ўдзелу ў чэмпіянаце свету па складанні шахматных кампазіцый запрашаюцца ўсе жадаючыя аматары кампазіцыі. Свае задачы і эцюды дасылайце на адрас рэдакцыі «Звязды»: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, з пометкай «Шахматы».**

Тэрмін — да 1 сакавіка 2012 г.

АСАБЛІВА НЕБЯСПЕЧНА...

Асуджаны два фігуранты сеткі наркадылераў, якую летась выкрылі супрацоўнікі дзяржбяспекі, паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

Яны займаліся пастаўкай і распаўсюджваннем у рэгіёне курыльных сумесяў, у састаў якіх уваходзіла асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва JWH-250. Два жыхары Гродна, 33-гадовы С. Андрыянаў і 28-гадовы М. Строганаў папоўнілі сваю крымінальную біяграфію чарговай судзімасцю — адпаведна да 8 і 6,5 года пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму. Раскрытая на Гродзеншчыне схема дзейнасці наркадылераў прывяла да выяўлення сеткі распаўсюджвання асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў у іншых абласцях Беларусі. Крымінальныя справы ў дачыненні астатніх удзельнікаў злачыннай схемы, у тым ліку трох жыхароў Мінска, будуць перададзены ў суд у бліжэйшы час. Летась упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці спынена пяць міжнародных каналаў пастаўкі наркотыкаў у краіну. Арганізатарам адначасова з іх з'яўляўся грамадзянін Літвы Р. Скерла, які быў затрыманы пры рэалізацыі 200 грамаў метамфетаміну, асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі і цяпер адбывае пакаранне ў папраўчай установе нашай краіны.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.52	16.56	9.04
Віцебск —	7.46	16.41	8.55
Магілёў —	7.42	16.46	9.04
Гомель —	7.34	16.47	9.13
Гродна —	8.06	17.12	9.06
Брэст —	8.01	17.18	9.17

Месяц

Маладзік 3 лютага.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Георгія, Івана, Макара, Мікалая, Пятра, Цімафея, Якава.*

К. *Веранікі, Андрэя, Юзафа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

4 лютага

1515 год — нарадзіўся (г. Нясвіж) Мікалай Радзівіл (Чорны), вядомы дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. Адзін з прадстаўнікоў найбуйнейшага магнацкага роду, вялікі канцлер літоўскі (1550), ваявода віленскі (1551), адміністратар Лівоніі. У 1555 г. перайшоў з лютэранства ў кальвінізм, выдаў на свае сродкі Біблію ў Брэсце (1563). Узначальваў дзяржаўную камісію па правядзенні аграрнай рэформы ў гаспадарчых маёнтках. Падтрымліваў палітычны саюз з Польшчай, аднак быў рашучым праціўнікам федэрацыі з ёй і адстойваў суверэнітэт ВКЛ. Пры ім Брэст і Нясвіж сталі цэнтрамі пратэстантызму ў Беларусі і Літве, адкрыты Брэсцкая і Нясвіжская друкарні. Памёр у 1565 годзе.

1945 год — пачалася Крымская (Ялцінская) канферэнцыя кіраўнікоў урадаў трох саюзных дзяржаў у 2-й сусветнай вайне — І. Сталіна, Ф. Рузвельта і У. Чэрчыля. На канферэнцыі былі вызначаны і ўзгоднены ваенныя планы саюзных дзяржаў і намечаны асноўныя прынцыпы іх пасляваеннай палітыкі з мэтай захавання трывалага міру і сістэмы міжнароднай бяспекі. Удзельнікі крымскай канферэнцыі заявілі аб сваёй мэце знішчыць германскі мілітарызм і нацызм. Савецкі Саюз даў згоду на пэўных умовах уступіць у вайну з Японіяй праз два—тры месяцы пасля заканчэння вайны ў Еўропе.

Цытата дня:

«Гэтак жа як добра пражыты дзень прыносіць лёгкі і шчаслівы сон, так і добра пражытае жыццё заканчваецца лёгкай смерцю».

Леанарда да Вінчы (1452—1519), італьянскі жывапісец, архітэктар, скульптар, інжынер.

ДВАРАВЫЯ ПАБУДОВЫ

Свіран (клець, гумно, тока, восець, асець, сушня, стадола) — сельскагаспадарчая пабудова, прызначаная для захавання жыта, сушкі і малацьбы збожжавых культур. У рытуальна-магічнай практыцы ўсходніх славян свіран сімвалізаваў ураджайнасць і пладавітасць. «Поўна клець» ці «Ёсць у свірне, будзе і ў кішэні» — выразы, якія азначаюць дабрабыт, прыбытак у гаспадарцы.

- Каб захаваць свой ураджай, свіран, гумно і іншыя пабудовы на падворку абпырсквалі святой вадой, абсыпалі чацвярговай соллю, утыкалі пад дахам асвячоныя галінкі вярбы, малявалі на Хрышчэнне крэйдай крыжы і г.д.
- Паўсюдна быў вядомы звычай: апошні сноп («дзедаву бараду») захоўваць у свірне.
- Для ўдалай малацьбы па кутах токі ўтыкалі некалькі калосаў жыта.
- У некаторых рэгіёнах на Ражство было прынята адчыняць дзверы свірнаў, каб на наступны год быць з ураджаем.
- Пасля жніва, калі пачыналі звазіць снапы з жытам, у парозе свірна (або гумна) клалі непачаты бохан хлеба.
- Усходнія славяне на першую шлюбную ноч слалі маладым ложак у гумне, каб іх сумесныя жыццё было добрым, нарадзіліся здаровыя дзеці, а сям'я жыла ў прыбытку.
- У натопленым свірне народныя лекары пры дапамозе магічных дзеянняў лячылі шматлікія хваробы, напрыклад, радыкуліт, ліхаманку, болі ў паясніцы і г.д. У тэкстах замоў даволі часта знахар звяртаецца да свірна і просіць забраць хваробы і немачы хворага чалавека.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Муз-news

НА «ЕЎРАБАЧАННІ-2011» АД МАЛДОВЫ ПРАГУЧЫЦЬ БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ?

Гэта цалкам верагодна, бо кампазіцыя нашых суайчыннікаў, кампазітара Яўгена Алейніка і паэткі Юліі Быкавай «Break it up» прайшла ў Малдове ў фінал нацыянальнага адборачнага тура на «Еўрабачанне-2011». Выконваць песню ўзяліся эстрадныя зоркі Барыс Коваль і Крысціна Краітору, бо, паводле ўмоў малдаўскага адбору, замежныя выканаўцы не маюць права ў ім удзельнічаць, а вось замежныя аўтары — колькі заўгодна.

«Гурт «Аўра», які я прадзюсірую і салісткай якога з'яўляецца Юлія Быкава, тройчы ўдзельнічаў у адборы на «Еўрабачанне» ад нашай краіны, — узгадвае Яўген Алейнік, — але шторазу журы выносіла незразумелы для нас вердыкт: «Вы не можаце ўдзельнічаць у конкурсе». І гэта без ніякіх тлумачэнняў. Затое кожны раз песняй, якую мы прадстаўлялі на адборы, цікавіліся замежныя артысты — напрыклад, прадзюсар Робі Уільямса Гай Чэмберс упадабаў нашу кампазіцыю «It's like a rainbow», якая беларускаму журы не спадабалася. Пра што пасля гэтага можна гаварыць?»

Карацей, сямейны і творчы тандэм вырашыў слоў дарма не траціць, а прыступіў адразу да справы: напісаў песню і звязаўся з малдаўскімі выканаўцамі. Цяпер кампазіцыя «Break it up» прэтэндуе на перамогу ў фінале нацыянальнага малдаўскага адбору, які адбудзецца 26 лютага. Пераможцу яго вызначаць сумесна прафесійнае журы і тэлегледачы.

ДЗМІТРЫЙ КАЛДУН РУШЫЦЬ У ЕЎРОПУ

Гучных пракламацый спявак не робіць, аднак паціху рушыць у абраным накірунку. Так, нядаўна Дзмітрый Калдун прадставіў слухачам новую песню «Out Of The Blue», запісаную ў дуэце з галандскай спявачкай Жаклін, уладальніцай каларатурнага сапрана, якая ў дадатак да класікі любіць эксперыментаваць з папулярнай музыкай. Вынікі тых эксперыментаў, дарэчы, карыстаюцца папулярнасцю: летась песня «Flame», запісаная сумесна з дыджэем Ронам ван дэр Бёкенам, заваявала першыя радкі хіт-парада Нідэрландаў.

Адметная дэталь: з прапановай супрацоўніцтва выступіў менавіта галандскі бок. «Калі Жаклін і яе прадзюсар Эрык Дзікеб выказалі прапанову, я згадзіўся, бо было вельмі цікава паўдзельнічаць у працэсе спалучэння двух зусім розных музычных накірункаў, — сцвярджае Дзмітрый Калдун. — Мне здаецца, што атрымалася выдатна».

Дуэтную кампазіцыю напісаў галандскі прадзюсар Маційс ван дэр Вен, а запіс адбываўся паралельна ў Нідэрландах і Расіі. Напрыканцы студзеня адбыліся таксама здымкі кліпа на песню, якая неўзабаве трапіць на еўрапейскія, расійскія і беларускія радыёстанцыі. Таксама песня патрапіць у другі сольны альбом выканаўцы. Выхад альбома запланаваны на вясну.

«СЯРЭБРАНАЕ ВЯСЕЛЛЕ» ДАСЦЬ ПАСЛУХАЦЬ СЭРЦА

Прынамсі такую выснову можна зрабіць з назвы першага студыйнага альбома кабарэ-бэнда. Пласцінка называецца «Сардэчная мускулатура» і, як сцвярджаюць самі музыканты, з'яўляецца найбольш дакладнай кардыяграмай сэрцабіцця калектыву.

«Гэта пэўны музычны спектакль, які праходзіць па таемных кутках сэрца, — прадстаўляе альбом салістка і лідар гурта Бенька (Святлана Бень). — Гэта даследаванне фізічнай і метафізічнай пабудовы сэрца праз песні, вершы, музычныя нумары і анатамічныя падрабязнасці. Кампазіцыі, якія ўвайшлі ў альбом, — маленькія гісторыі з жыцця людзей, птушак, сабак і выкінутых на сметніцу рэчаў; а па сутнасці, гісторыі пра чалавечае сэрца, заўжды крохкае, але на дзіва трывалае, поўнае ўспамінаў і спадзяванняў на цуд...».

Жывая прэзентацыя альбома ў Мінску адбылася ў апошнія дні студзеня ў межах некалькіх вялікіх двухактавых канцэртаў. Сам жа дыск ужо чакае меламанаў на паліцах музычных крамаў.

«ЛЯПІС ТРУБЯЦКІ» СТАЎ МУЛЬТЫКАНФЕСІЙНЫМ

Калектыў прадставіў публіцы сваю новую пенсю «Я веру», якая ўвойдзе ў новы альбом «Вясёлыя карцінкі» (яго рэліз прызначаны на 11 сакавіка). У прыпеве гэтай кампазіцыі ёсць такія словы: «Я веру ў Ісуса Хрыста, я веру ў Гаўтаму Буду, я веру ў прарока Мухамада...». Акрамя таго, у песні згадваюцца Крышна, Тор, Джа і яшчэ цэлы шэраг багоў розных эпох і кантынентаў.

«Усё, што датычыць рэлігіі, веры, у нас альбо абрастае патрыярхальным пафасам, альбо людзі пра гэта ўвогуле імкнуцца не гаварыць: аднекваюцца, аджартоўваюцца, хіхікаюць, — разважае лідар гурта Сяргей Міхалок. — Таму мне і захацелася зрабіць песню, прысвечаную гэтай складанай і нават, я б сказаў, далікатнай тэме. Прычым такую поп-песеньку, у зразумелым і даступным для ўсіх троххвілінным фармаце».

Дарэчы, з запускам новай песні гурт абвясціў для прыхільнікаў суперконкурс. Ахвотным прапануецца стварыць паводле песні «Я веру» візуальны матэрыял — фота, відэа, анімацыю, графіку, жывапіс або калаж. 10 фіналістаў, якіх абяруць удзельнікі гурта і прадстаўнікі каманды «Будзьма разам!», атрымаюць падарункі з аўтографамі, а таксама па два білеты на адзін з канцэртаў тура «Вясёлыя карцінкі». Галоўным жа прызам будзе паездка на прэзентацыю альбома ў Маскву, Санкт-Пецярбург ці Мінск, прычым пераможцу аплацяць не толькі дарогу туды і назад з любога пункта СНД, але таксама пражыванне і VIP-квіток. Конкурсныя работы, аб'ём якіх не павінен перавышаць 25 Мб, прымаюцца да 25 лютага на адрас lyapis@budzma.org з пометкай «Будзь свабодным!» (неабходна пазначыць таксама сваё імя, узрост, паштовы адрас і нумар мабільнага тэлефона).

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Усміхнемся

Новы «Боінг» змяшчае 400 пасажыраў ці 200 амерыканцаў.

☺

Выхавальніца ў дзіцячым садку:

— Дзеці, зараз жа развяжыце мяне!

Дзеці (хорам):

— Не-а! Кашу есці не будзем!

☺

Маці 11 дзяцей заявіла, што да поўнай калекцыі ёй не хапае толькі Вадалея...

☺

— Ведзьму спаліць!

— Але ж яна такая прыгожая...

— Добра, але потым спаліць!

☺

Камары — гэта душы памерлых падатковых інспектараў.

☺

— У якой руцэ трэба трымаць нож, а ў якой відэлец?

— А я нападаю ці абараняюся?

☺

Жыццё — добры доктар, але дрэнны касметолаг.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, скаратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 565. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12